Цана асобнага нумару 10 кап

Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
פראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַראייניקט אייך!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

16-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА

ПАНЯДЗЕЛАК
27 ЛЮТАГА 1933 г.
№ 46 (3706)

ТЭЛЕФОНЫ:
Адказны рэдактар 769
Адказны сакратар 4-78
Сэктароў 6-15
Начная рэдакцыя 12-65 (два званка)
Выдавецтва 2-44
АЎТАМАТЫ:
Адк. рэдактар 20-831
Адк. сакратар 22-161
Сэктары 22-160
Кантора [illegible]

УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц 2 р. 40 к.
3 „ 7 р. 20 к.
6 „ 14 р. 40 к.
Падпіска прымаецца і выключна на пошце і лістаносцамі.
Рукапісы не зьвяртаюцца

РЭДАКЦЫЯ І ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК, ПЛЯЦ ВОЛІ, 17.
КОШТ АБ'ЯВЫ: 1 радок компанэлі 1 руб. [illegible]
КОШТ ПУБЛІКАЦЫ: аб згубе 1 дакументу 2 руб.

Наша бліжэйшая задача—зрабіць усіх калгасьнікаў заможнымі

Так акрэсьліў сэнс і мэту барацьбы, якая разгортваецца за ўмацаваньне калгасаў, тав. Сталін у сваёй прамове на першым Усесаюзным зьезьдзе калгасьнікаў-ударнікаў. Гэта прамова тав. Сталіна ў спалучэньні з яго выступленьнямі на студзеньскім пленуме ЦК і ЦКК аб выніках першай пяцігодкі і аб працы ў вёсцы, дае ўсеахапляючую праграму работ партыі ў галіне сельскай гаспадаркі і адначасова зьяўляецца каштоўнейшым укладам у аграрную тэорыю ленінізму.

Нібы старое пытаньне аб шляхох разьвіцьця. Але чаму правадыр партыі зноў і зноў варочаецца да гэтага пытаньня, аб якім, сумленна кажучы, нашы «тэарэтыкі» лічаць нібы непатрэбным многа гаварыць? Тав. Сталін зноў узьнімае гэта пытаньне на новую прынцыповую вышыню, грунтуючыся ня толькі на тэарэтычных прадпасылках, але і на насьпеўшым ужо працэсе практычнай барацьбы і работы ў сьвядомасьці найшырэйшых пластоў калгаснага актыву, узьнімае таму, што ЁСЬЦЬ ЯШЧЭ ЧАСТКА ПРАЦОЎНАГА СЯЛЯНСТВА, І НЯ ТОЛЬКІ АДНААСОБНАГА, АЛЕ І КАЛГАСНАГА, якая сумняваецца ў правільнасьці калгаснага шляху.

«Ці павінны мы расьсеяць гэтыя сумненьні?—пытаўся на зьезьдзе калгасьнікаў-ударнікаў тав. СТАЛІН. Ці павінны мы выставіць іх, гэтыя самыя сумненьні, на сьвет божы і паказаць—чаго яны варты? Ясна, што павінны».

Калі ты камуніст, партыец—ты не ганарыся тым, што для цябе ўсё ўжо ясна, што ў цябе ніякіх сумненьняў наконт правільнасьці калгаснага шляху няма. Ты ўлічы, што вакол цябе нямала людзей, якім можа быць яшчэ няясна тое, што ясна табе, і не ганарыся, не праходзь міма іх сумненьняў, не лай іх за тое, што яны такія незразумелыя. ЦЕРПЯЛІВА, ПА ЛЕНІНСКУ. ПА БАЛЬШАВІЦКУ РАСТЛУМАЧВАЙ І ДАКАЗВАЙ, РАСЬСЕЙВАЙ ГЭТЫЯ СУМНЕНЬНІ.

Гэта і ёсьць ленінскае кіраўніцтва. Гэта і ёсьць ленінскі мэтад у рабоце.

Толькі аддаліўшыся ад старога, аднаасобнага ладу жыцьця на рад год, толькі прабіўшыся да новага ў жорсткіх баёх з векавечным, самым цёпкім і шматлікім ворагам сваім—кулацтвам, толькі агледзеўшы лад калгаснага жыцьця, усё мінулае, радавы працоўны селянін пачынае разумець, што ён выбраўся з такога балота, якое ў выпадку, калі-б ён чапляўся за яго і далей ЗАСАСАЛА-Б ЯГО КАНЧАТКОВА, ВЯРНУЛА-Б ЯГО НАЗАД, ПАД УЛАДУ ПАМЕШЧЫКА, ФАБРЫКАНТА, КУЛАКА, ПАД УЛАДУ БУРЖУАЗНАГА ЎРАДУ.

Вось чаму з новай сілай, з новай пераканальнасьцю гучаць сёньня для шырокіх мас сялянства словы тав. Сталіна: «Ёсьць толькі два шляхі: АБО НАПЕРАД, НА ГАРУ,—ДА НОВАГА КАЛГАСНАГА ЛАДУ, АБО НАЗАД, З ГАРЫ—ДА СТАРОГА КУЛАЦКА-КАПІТАЛІСТЫЧНАГА ЛАДУ. Трэцяга шляху няма».

За першыя два-тры гады калгаснага будаўніцтва мы дабіліся таго, што «ня менш 20 млн. сялянскага насельніцтва, ня менш 20 млн. беднякоў—выратавалі ад кулацкай кабалы і ператварылі, дзякуючы калгасам у забясьпечаных людзей. Мільёныя масы беднякоў, якія раней жылі ў прагаладзь, сталі цяпер у калгасах сераднякамі, людзьмі забясьпечанымі. Гэта такое дасягненьне, якога ня ведаў яшчэ сьвет і якога яшчэ не дасягала ні адна капіталістычная дзяржава ў сьвеце» (СТАЛІН).

Вось чаму так адчувальнай стала цяпер для кожнага селяніна сувязь калгаснага шляху з лёсам савецкай улады, з лёсам кастрычніцкіх заваяваньняў.

Але гэтага мала. На гэтым ПЕРШЫМ дасягненьні партыя не затрымліваецца. Яна ставіць новую задачу, яна робіць ДРУГІ крок. «У чым заключаецца гэты ДРУГІ крок? Ён заключаецца ў тым, каб узьняць калгасьнікаў—былых беднякоў і былых сераднякоў—яшчэ вышэй. Ён заключаецца ў тым, каб ЗРАБІЦЬ УСІХ КАЛГАСЬНІКАЎ ЗАМОЖНЫМІ».

Ці пад сілу гэта задача? Так, пад сілу і зусім магчыма да ажыцьцяўленьня, бо ў нас ужо ёсьць тысячы калгасаў, якія могуць паказаць практычныя вынікі ў гэтым кірунку. Пад сілу таму, што ГАЛОЎНЫЯ ТРУДНАСЬЦІ НА ШЛЯХУ КАЛГАСНАГА БУДАЎНІЦТВА ЎЖО ПРОЙДЗЕНЫ, і ў распараджэньні калгасаў і калгасьнікаў ёсьць усё неабходнае для дасягненьня гэтай мэты.

«Сіла ў вашых руках,—сказаў калгасьнікам-ударнікам тав. Сталін, у самым пачатку сваёй прамовы і заля адказала на гэтыя словы бурай апледысмэнтаў. Гэта ня быў, як некаторыя могуць падумаць, звычайны аратарскі прыём. Не, гэтай думкай, гэтым довадам прасякнута ўся прамова тав. Сталіна ад пачатку да канца. І патрабаваньне да камуністаў ня толькі вучыць, але і вучыцца ў беспартыйных, і папраўка да ліста безанчукскіх калгасьнікаў, і акрэсьленьне, што сацыялізм і праца неадлучны адзін ад другога, усё гэта і іншыя месцы прамовы зьяўляюцца выразам тэй самай думкі!

Ці можна дабіцца гэтай мэты, г. зн. зрабіць заможнымі ўсіх беднякоў і сераднякоў без калгасаў, паміма калгаснага шляху? Усім яшчэ памятны дэмагагічныя па форме і авантурна-рэакцыйныя па зьмесце патрабаваньні зіноўеўскай апазыцыі даць кожнаму па каню. Усё яшчэ памятна праваапартуністычная тэорыя ўрастаньня кулака ў сацыялізм якая сапраўджалася лёзунгамі: «узбагачайцеся», «накапляйце ў добры час».

Да чаго-б гэта прывяло партыю, савецкую ўладу, рабочых і працоўнае сялянства, калі-б апазыцыянэры і правыя апартуністы не атрымалі рашучага адпору, калі-б яны не былі разгромлены?

ДА ЎЗБАГАЧЭНЬНЯ І ЎЛАДЫ КУЛАКА. ДА ПОЎНАЙ РЭСТАЎРАЦЫІ КАПІТАЛІЗМУ. Бо «для таго, каб стаць заможным (пры аднаасобным ладзе вёскі. Рэдакцыя), трэба было крыўдзіць сваіх суседзяў, трэба было паэксплёатаваць іх, прадаваць ім даражэй і купляць у іх танней, наняць сяго-таго з батракоў, паэксплёатаваць іх як належыць, накапіць капіталец і, умацаваўшыся, пралезьці потым у кулакі» (Сталін).

Гэтай азбукі марксызму-ленінізму так і не маглі зразумець прыхільнікі «трэцяга шляху».

Ці шмат трэба для таго, каб зрабіць усіх калгасьнікаў заможнымі?

Не ня многа. «ВАРТА ТОЛЬКІ ПАЛЕПШЫЦЬ СКАРЫСТАНЬНЕ МАШЫН І ТРАКТАРОЎ, ВАРТА ТОЛЬКІ ПАЛЕПШЫЦЬ АПРАЦОЎКУ ЗЯМЛІ, —І МЫ ДАБ'ЁМСЯ ТАГО, ШТО ПАВЯЛІЧЫМ КОЛЬКАСЬЦЬ НАШЫХ ПРАДУКТАЎ УДВАЯ, УТРАЯ. А ГЭТА ЗУСІМ ДАВОЛІ ДЛЯ ТАГО, КАБ ЗРАБІЦЬ УСІХ КАЛГАСЬНІКАЎ ЗАМОЖНЫМІ ПРАЦАЎНІКАМІ КАЛГАСНЫХ ПАЛЁЎ» (Сталін).

«Сіла ў нашых руках», у руках перадавой часткі калгасьнікаў, якімі кіруе партыя. Ад гэтай сілы залежыць, зараз пасьпяховае вырашэньне новай задачы сусьветна-гістарычнага значэньня. Гэта зразумеў і ацаніў СЁНЬНЯ зьезд прадстаўнікоў перадавых калгасаў, які паклаў гэту думку тав. Сталіна ў асновы сваёй адозвы.

«Ад вас—гаварыў тав. Сталін калгасьнікам,—патрабуецца толькі адно—працаваць чэсна, дзяліць калгасныя даходы паводле працы, берагчы калгаснае дабро, берагчы трактар і машыны, устанавіць добры догляд каня, выконваць заданьні нашага рабоча-сялянскага ўраду, умацоўваць калгасы і вышыбаць вон з калгасаў пралезшых туды кулакоў і падкулачнікаў».

І сапраўды, хіба-ж труднасьці, якія стаяць на шляху ажыцьцяўленьня гэтай праграмы ў якой небудзь меры могуць параўнацца з тымі сапраўднымі труднасьцямі, калі трэба было павярнуць на калгасны шлях, які ня досыць быў вядомы мільёнам, асноўную масу сялянства, калі гэтую масу сялянства трэба было падняць супроць кулацтва, калі трэба было разграміць і ліквідаваць гэтага сур'ёзнага і небясьпечнага ворага?

Тысячы раз мае рацыю тав. Сталін, калі ён гаворыць, што ў параўнаньні з тымі галоўнымі труднасьцямі, цяперашнія не заслугоўваюць нават таго, каб аб іх сур'ёзна гаварыць.

Сіла ў нашых руках. Гэта павінны даказаць цяпер-жа ўсе партыйныя арганізацыі, усе камсамольцы, усе перадавыя чэсныя калгасьнікі, рыхтуючыся да вясны, рыхтуючыся да веснавой сяўбы. Прамова тав. Сталіна выдатна іменна тым, што яна мабілізуе партыю і масы на вырашэньне новай гістарычнай задачы, робіць улік усіх рухавых сіл сацыялізму і вызначае асноўныя задачы для кожнага баявога атраду. Яна разам з тым у вялізарнай меры аслабляе рэшткі сіл класавага ворага, рэшткі яго ўплыву, вышыбае ў яго з пад ног апошнюю глебу.

Партыйныя арганізацыі і беспартыйны калгасны актыў атрымліваюць такім чынам у барацьбе за ўмацаваньне калгасаў, за заваяваньне большасьці ў калгасах, за ўзорнае правядзеньне веснавой сяўбы новую зброю выключнай сілы. Гэтую зброю трэба па-бальшавіцку выкарыстаць.

ПЕРШЫ ЎСЕСАЮЗНЫ ЗЬЕЗД КАЛГАСЬНІКАЎ - УДАРНІКАЎ БЯССПРЭЧНА ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА АДНЭЙ З НАЙБОЛЬШ ЯРКІХ СТАРОНАК У ГІСТОРЫІ БАРАЦЬБЫ ЗА САЦЫЯЛІЗМ. Як і ўсякі выдатны акт гэтай барацьбы, ён далёка выходзіць за межы нашай краіны, набываючы вялізарнае міжнароднае значэньне. З няўмольнай яснасьцю акрэсьліваецца намі нучы вынік спаборніцтва двух сыстэм —капіталістычнай і сацыялістычнай. У той час, як спарахнелы капіталізм усё больш і больш выяўляе сваё бясьсільле выбрацца з пятлі крызісу, якая моцна захліснула яго ў той час, як у сударажных спробах вызваліцца з гэтай пятлі ён кідае новыя і новыя мільёны працоўных у пучыну галечы і зруйнаваньня,—сацыялізм пераможна высоўвае новы лёзунг—заклік, лёзунг сёнешняга дня, новыя і новыя мільёны працоўных падняць—«да ўзроўню заможных, да ўзроўню людзей, якія карыстаюцца багацьцем прадуктаў і вядуць зусім культурнае жыцьцё.

(СТАЛІН)

ГЭТАГА МЫ МОЖАМ ДАБІЦЦА І ГЭТАГА МЫ ПАВІННЫ ДАБІЦЦА ВА ШТО-Б ТАМ НІ СТАЛА! (Скарочаная перадавая «Праўды»).

27 лютага а 7 гадз. увечары ў памяшк. ЦК КП(б)Б заля пасяджэньняў бюро

СКЛІКАЕЦЦА НАРАДА

адказных работнікаў ЦК КП(б)Б, ЦКК, гаркому, ЦК ЛКСМБ, ЦСПСБ, ЦВК, НКЗБ, БКС, рэдактароў і загадчыкаў аддзелаў газэт

Абвестка дня:

1. Інфармацыя т. Кортукова аб усесаюзным зьезьдзе калгасьнікаў-ударнікаў

ЦК КП(б)Б

Аб ходзе загатовак сельска-гаспадарчых прадуктаў па БССР

Пастанова аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б

Заслухаўшы паведамленьне аб ходзе загатовак сельска-гаспадарчых прадуктаў у БССР, Аб'яднаны Пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б адзначае, што ход загатовак па БССР са ўсёй відавочнасьцю пацьвярджае абсалютную правільнасьць пастановы ЦК УсеКП(б) аб нездавальняючай рабоце ЦК КП(б)Б і СНК БССР у справе кіраўніцтва загатоўкамі сельска - гаспадарчых прадуктаў.

Той факт, што ў другой палове сьнежня м-ца, пасьля пастановы ЦК УсеКП(б), партыйныя і савецкія арганізацыі Беларусі змаглі сапраўдна па баявому выканаць у кароткі тэрмін (каля 50 проц. застаўшагася гадавога пляну) і поўнасьцю загатоўкі хлеба, мяса і ў студзені м-цы—бульбы і тая акалічнасьць, што па загатоўкам ільнавалакна, малочных прадуктаў, гарнцэваму збору і закупцы хлеба — БССР плянецца ў хвасьце раду вобласьцей Саюзу—сьведчыць, што партыйныя і савецкія арганізацыі Беларусі да гэтага часу не зрабілі неабходных вывадаў у сваёй рабоце з пастановы ЦК УсеКП(б) і ня ўлічылі ўсяго вопыту сьнежня м-ца па барацьбе за загатоўкі.

Многімі партыйнымі і савецкімі арганізацыямі (ня толькі раённымі, але і цэнтральнымі) не вядзецца, як належыць ўмоцненая барацьба з класава-дэклярацыйнымі адносінамі камуністаў да правядзеньня генэральнай лініі партыі і ўзмоцненая барацьба з гніла - перараджэнчаскімі элементамі партыі, якія вельмі часта прыкрываюць сваю анты-савецкую работу фальшыва-нацыянальным флагам.

Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б адзначае, што пасьпяховае правядзеньне дзяржаўных загатовак магчыма толькі на аснове разгорнутай барацьбы за бальшавіцкае ажыцьцяўленьне паказаньняў ЦК УсеКП(б): «што толькі ачысьціўшы рады партыі ад гэтых буржуазных перараджэнчаскіх элементаў і на справе даўшы іх уплыву бальшавіцкі адпор, камуністычная партыя Беларусі здолее зламаць супраціўленьне, якое арганізуецца кулацкімі і іншымі анты-савецкімі элементамі справе загатовак сярод аднаасобнікаў і калгасьнікаў і ўмацаваць калгасы, шляхам згуртаваньня калгаснай масы вакол сапраўды перадавых калгасьнікаў у актыўнай барацьбе з разлагаючым уплывам пралезшых у іх чужых, спэкулянцкіх і наогул анты-савецкіх элементаў, якія сабатуюць дзяржаўныя загатоўкі».

Аб'яднаны Пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б асабліва падкрэсьлівае дрэнны ход выкананьня пляну ільнозагатовак па БССР (на 15-е лютага г. г.,—86,5 проц. выкананьня гадавога пляну), які сьведчыць аб зрыву выкананьня пляну ва ўстаноўлены ЦК КП(б)Б тэрмін як па рэспубліцы ў цэлым, так і па большасьці раёнаў, што зьяўляецца вялікай ганьбай для ўсіх партыйных і савецкіх арганізацый БССР.

Асабліва ганебным, проста злачынным зьяўляецца становішча загатовак ільна-валакна па наступных раёнах: Сірацінскім, Мсьціслаўскім, Сеньненскім, Горацкім, Полацкім, Веткаўскім, Расонскім, Асьвейскім, Вушацкім, Багомльскім, Чэрвеньскім, Камарынскім, Клічаўскім, Рэчыцкім, Заслаўскім і Віцебскім.

Улічваючы, што важнейшай вядучай тэхнічнай сельска-гаспадарчай культурай у БССР зьяўляецца лён і ў гэтай галіне БССР займае адзін з важнейшых вучасткаў у СССР, Пленум ЦК і ЦКК лічыць, што гэта накладвае вялізарныя абавязкі і адказнасьць на ЦК, ЦКК, СНК і ўсе партыйныя і савецкія арганізацыі ў БССР за безумоўнае і поўнае выкананьне дзяржаўнага пляну ільнозагатовак, маючы на ўвазе, што ўжо на сёнешні дзень маецца 25 раёнаў, выканаўшых свае заданьні па ільну на 100 проц.

Аб'яднаны Пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б патрабуе ад усіх партыйных і савецкіх арганізацый БССР, на аснове мабілізацыі калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас і рашучай барацьбы з кулацтвам і яго агентамі ў партыі і савецкім апараце—скончыць поўнае выкананьне пляну ільнозагатовак да 27-га лютага 1933 г. в тым, каб да 1-га сакавіка былі падведзены вынікі аб поўным выкананьні пляну.

Пленум ЦК і ЦКК папярэджвае РК і РВК, што гэты тэрмін зьяўляецца канчатковым. Пленум ЦК і ЦКК ухваляе меры, прынятыя Бюро ЦК адносна рада ільнаводчых раёнаў і даручае Бюро ЦК і Прэзыдыуму ЦКК ў далейшым прыняць строгія меры спагнаньня да партыйнага і савецкага кіраўніцтва раёнаў, поўнасьцю невыканаўшых плянаў ільнозагатовак да паказанага тэрміну.

Прызнаць ход і арганізацыю загатовак малочных прадуктаў за першы квартал і работу Наркамснаба, Белкаапсаюзу і Белмаслапрому ў гэтай галіне—яўна нездавальняючай.

Пленум ЦК і ЦКК прапануе Наркамснабу, Белкаапсаюзу, Белмаслапрому і ўсім раённым партыйным і савецкім арганізацыям прыняць рад мерапрыемстваў (масавай праверкі давядзеньня абавязкаў да кожнага калгаса, калгасьніка, аднаасобніка і выкананьня імі здачы прадукцыі, прыняцьця рашучых захадаў узьдзейнічаньня у адносіне ўхіляючыхся, падбор кадраў, забесьпячэньне тарай, інвэнтаром і інш.) якія забясьпечваюць поўнае і своечасовае выкананьне дзяржаўных плянаў загатовак малочных прадуктаў. Адначасова павесьці рашучую барацьбу з усялякімі фактамі разбазарваньня малочных прадуктаў, разглядаючы гэтыя справы, як раскрадваньне дзяржаўнай маемасьці і супраціўленьне выкананьню дзяржаўных заданьняў.

Пленум ЦК і ЦКК абавязвае ўсе партыйныя і савецкія арганізацыі дабіцца поўнага выкананьня дзяржаўных плянаў загатовак сельска-гаспадарчых прадуктаў кожным калгасам, гаспадаркай калгасьніка і аднаасобніка, памятуючы, што невыкананьне пляну ўсімі гаспадаркамі—стварае пагрозу зрыва выкананьня плянаў загатовак у наступных кварталах у цэлым.

Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК канстатуе ганебнае становішча выкананьня пляну памольнага збору па рэспубліцы і прапануе ўсім партыйным і савецкім арганізацыям прыняць—на аснове прынятых Бюро ЦК рашэньняў—захады, сапраўды забясьпечваючыя поўнае выкананьне плянаў памольнага збору, памятуючы, што апошні (памольны збор) зьяўляецца неадлучнай часткай пляну дзяржаўных загатовак.

Ухваліць рашэньне Бюро ЦК, якое ўстанаўлівае парадак адпуска хлеба гарадам і раёнам у поўнай залежнасьці ад выкананьня пляну памольнага збору.

Аб'яднаны Пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б адзначае, што ня гледзячы на дырэктывы ЦК і СНК аб разгортваньні работы па закупцы збожжа, апошняя праводзіцца надзвычайна дрэнна. Гэта зьяўляецца рэзультатам ня толькі недастатковай увагі з боку мясцовых партыйных і савецкіх арганізацый да гэтай справы, але і яўным супраціўленьнем загатавіцельных, закупачных і каапэрацыйных арганізацый перабудове ўсёй работы па закупцы збожжа з тым, каб забясьпечыць на справе канкрэтнае апэрацыйнае кіраўніцтва гэтай работай з іх боку (адсутнасьць увагі да пытаньняў асартымэнту тавараў, да штодзённага кантролю за гэтай справай, нежаданьне зьмяніць практыку загатоўчай сыстэмы на практыку закупкі збожжа з індывідуальным падыходам да калгасу, калгасьніка і аднаасобніка-бедняка і серадняка).

Пленум ЦК і ЦКК прапануе Упаўнаркамзагапа, упаўнаважанаму «Закупхлеба», Белкаапсаюзу і ўсім раённым партыйным і савецкім арганізацыям прыняць неадкладна рад арганізацыйных і гаспадарчых захадаў, забясьпечваючых поўнае і своечасовае выкананьне пляну закупкі збожжа.

У мэтах пасьпяховага правядзеньня дзяржаўных загатовак ураджаю 1933 г. і ўлічваючы, што апошнія будуць працякаць ва ўмовах абвостранай класавай барацьбы, Пленум ЦК і ЦКК папярэджвае ўсе партыйныя і савецкія арганізацыі аб недапушчальнасьці недаацэнкі цяжкасьцяй будучых загатовак і прапануе зьвярнуць выключную ўвагу на прапрацоўку плянаў загатовак усіх сельска-гаспадарчых прадуктаў, своечасовае давядзеньне іх да калгасу, калгасьніка і двара аднаасобніка. РК, РВК, загатоўчыя і гаспадарчыя арганізацыі ў сваёй рабоце павінны максымальна выкарыстаць вялізарнае гаспадарча-палітычнае значэньне закона аб абавязковай пастаўцы збожжа дзяржаве, калгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі, разгарнуўшы вакол гэтага закону і кожнага пункту яго ў паасобку бальшавіцкую работу сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў.

Пленум ЦК і ЦКК асабліва патрабуе ад партыйных арганізацый увагі да праверкі становішча работы і складу работнікаў загатавіцельнага апарату і падбора для яго лепшых правераных работнікаў, якія прайшлі вопыт загатоўчай работы.

Аб'яднаны Пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б прымае да няўхільнага кіраўніцтва крытыку і паказаньні тав. Сталіна, зробленыя ім на студзеньскім аб'яднаным пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б) і пастанову ЦК УсеКП(б) аб загатоўках у БССР.

Партарганізацыя БССР і ў першую чаргу яе кіруючыя кадры зробяць усе неабходныя вывады з пастановы ЦК УсеКП(б) і прамовы т. Сталіна, сканцэнтруюць усе свае сілы на найхутчэйшай перабудове работы партыйных і савецкіх арганізацый, зьмена мэтадаў кіраўніцтва калгасамі і не на словах, а на справе падымуць усю КП(б)Б на барацьбу за поўнае выкананьне пляну загатовак ільна і іншых сельскагаспадарчых прадуктаў і на барацьбу за поўнае выкананьне пляну хлебазакупак, засыпкі насенных фондаў, падрыхтоўку і пасьпяховае правядзеньне вясеньняй пасеўнай кампаніі.

Пра абавязковую пастаўку збожжа дзяржаве калгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР і ЦК КП(б)Б

У адпаведнасьці з пастановай СНК СССР і ЦК УсеКП(б) за 19 студзеня 1933 г. «Пра абавязковую пастаўку збожжа дзяржаве калгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі» (З. З. СССР 1933 г. № 4, арт. 25) і пастановай Савету Працы і Абароны за 27 студзеня 1933 году «Пра нормы здачы дзяржаве збожжа ўраджаю 1933 г. па асобных культурах» (З. З. СССР 1933 г., № 5, арт. 35), Савет Народных Камісараў БССР і Цэнтральны Камітэт КП(б)Б ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:

1. Скасаваць існуючую дагаворную (кантрактацыйную) сыстэму загатовак збожжавых культур і ўстанавіць для калгасаў і аднаасобных гаспадарак, маючыя сілу падатку цьвёрдыя абавязацельствы па здачы збожжа дзяржаве па ўстаноўленых дзяржаўных цэнах.

2. Устанавіць наступныя, зацьверджаныя, пастановай СНК СССР ад 21 лютага 1933 г. № 263 параённыя сярэднія па ўсіх збожжавых культурах і па асобных збожжавых культурах нормы здачы калгасамі збожжа дзяржаве з ураджаю 1933 году, з разьлікам на кожны гэктар устаноўленага пляну пасеву яравых і на кожны гэктар фактычнага пасеву азімых збожжавых культур (у клгр):

а) ДЛЯ КАЛГАСАЎ, ЯКІЯ НЕ АБСЛУГОЎВАЮЦЦА МТС.

РАЁНЫ	Жыта	Пшаніца	Авёс	Ячмень	Бабовыя	Крупяныя	Інш. збожжавыя культуры	Сярэдняя норма па ўсіх збожжавых культурах
1 група								
1. Аршанскі								
2. Брагінскі								
3 Віцебскі								
4. Гомельскі								
5. Заслаўскі								
6 Капыльскі								
7. Дзяржынскі								
8. Лёзьненскі	85	70	115	115	55	65	65	94
9. Магілеўскі								
10 Менскі								
11. Мсьціслаўскі								
12. Сеньненскі								
13. Слуцкі								
14 Сураскі								
15. Чавускі								
16. Чырвона-Слабодскі								
17. Шклоўскі								
2 група								
18 Бабруйскі								
19. Барысаўскі								
20. Буда-Кашалёўскі								
21. Бешанковіцкі								
22 Быхаўскі								
23. Бялыніцкі								
24. Вуьдзенскі								
25. Гарадоцкі								
26 Горацкі								
27. Дрысенскі								
28. Дубровенскі								
29 Касьцюковіцкі								
30 Клімавіцкі								
31. Клічаўскі								
32 Крычаўскі	75	65	110	110	50	60	60	84
33 Лагойскі								
34. Лепельскі								
35. Полацкі								
36. Пухавіцкі								
37. Рэчыцкі								
38. Рагачоўскі								
39. Расонскі								
40. Сіроцінскі								
41. Смалявіцкі								
42 Талачынскі								
43. Вушацкі								
44. Уваравіцкі								
45 Хойніцкі								
46. Чэрвеньскі								
47. Чэрыкаўскі								
3 група								
48. Асьвейскі								
49. Асіповіцкі								
50. Бярэзінскі								
51. Веткаўскі								
52. Глускі								
53. Ельск								
54. Жлобінскі								
55. Камарынскі								
56 Карлмаркскі								
57. Крупскі	70	60	105	103	45	45	45	76
58. Лоеўскі								
59. Мазырскі								
60. Парыцкі								
61. Пятрыкоўскі								
62. Прапойскі								
63. Старобінскі								
64 Тураўскі								
65 Церахаўскі								
66 Чачэрскі								
67. Чашніцкі								
68 Чырвонапольскі								
4 група								
69. Багомльскі								
70. Жыткавіцкі								
71. Лельчыцкі								
72. Нараўлянскі	65	55	100	100	40	40	40	70
73. Любанскі								
74. Плешчаніцкі								
75. Стара-Дарожскі								

б) для калгасаў, якія абслугоўваюцца МТС

Для 1 групы раёнаў	60	60	85	85	45	60	60	70
Для 2 групы раёнаў	55	55	80	80	40	50	50	65
Для 3 групы раёнаў	50	50	75	75	35	45	45	60
Для 4 групы раёнаў	45	45	70	70	30	40	40	52

Устаноўленыя ў гэтым артыкуле па раённыя нормы здачы па асобных збожжавых культурах і сярэднія па ўсіх збожжавых культурах зьяўляюцца абавязковымі для ўсіх калгасаў данага раёну і ня могуць быць зьменены.

3. Колькасьць збожжа якая павінна быць здана дзяржаве кожным калгасам, вызначаецца раённымі выканаўчымі камітэтамі на дакладнай падставе арт. 2 гэтай пастановы.

4. Устанавіць наступныя сярэднія для БССР календарныя тэрміны выкананьня калгасамі гадавых абавязацельстваў па здачы збожжа дзяржаве ў процантах ад пагэктарных норм, устаноўленых арт. 2 гэтай пастановы.

У жніўні месяцы 10 проц.
У верасьні месяцы 30 проц.
У кастрычніку 35 проц.
У лістападзе месяцы 25 проц.

Устанавіць для паасобных зон наступныя цьвёрдыя тэрміны здачы збожжа ў процантах.

	Жнівень	Верасень	Кастрычнік	Лістапад
Для паўднёвых раёнаў	15	35	40	10
« цэнтральных раёнаў	12	35	45	8
« паўночных раёнаў	5	30	55	10

Прапанаваць Упаўнаважанаму Камітэту Загатовак і НК Земляробства не пазьней як праз 2 дні апублікаваць сьпіс раёнаў па вышэйуказаных 3-х зонах.

5. Парадак вызначэньня разьмераў здачы збожжа дзяржаве калгасамі, устаноўлены гэтай пастановай, не пашыраецца на аднаасобныя гаспадаркі. Для аднаасобных гаспадарак захоўваецца існуючы цяпер парадак вызначэньня разьмераў збожжаздачы, а іменна: сельскія саветы ўстанаўляюць для кожнай аднаасобнай гаспадаркі цьвёрдыя абавязацельствы па здачы збожжа дзяржаве, выходзячы з фактычна-засеянай плошчы азімых і цьвёрдага пляну сяўбы яравых збожжавых культур, устаноўленага сельскім саветам для кожнай аднаасобнай гаспадаркі, а таксама выходзячы з таго, каб здача з га аднаасобнымі гаспадаркамі, была на 5—10 процантаў вышэй норм, устаноўленых для калгасаў данага раёну як па асобных збожжавых культур, так і сярэднія па ўсіх збожжавых культурах).

6. Для аднаасобных гаспадарак устанавіць гранічны тэрмін поўнага выкананьня ўстаноўленых для іх гадавых плянаў збожжаздачы—1 лістапада 1933 г.

Тэрміны здачы збожжа па асобных зонах устанавіць:

	Жнівень	Верасень	Кастрычнік
Для раёнаў паўднёвай зоны	25	60	15
« цэнтральнай зоны	20	70	10
« паўночнай зоны	15	70	15

7. Захаваць існуючыя цэны на збожжа, якое здаецца дзяржаве.

8. Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты не пазьней 15 сакавіка 1933 году ўручыць кожнаму калгасу абавязацельствы па здачы збожжа па культурах з указаньнем тэрмінаў яго выкананьня.

Да гэтага-ж тэрміну ўручыць кожнай аднаасобнай гаспадарцы абавязацельствы па здачы збожжа дзяржаве з указаньнем разьмераў здачы па кожнай культуры паасобку, а таксама тэрмінаў выкананьня ўсяго заданьня.

9. Пры здачы збожжа дзяржаве калгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі дапускаецца замена аднэй культуры другой (проса замест грэчкі і наадварот,

Не дапускаецца толькі замена харчовых культур — пшаніцы і жыта фуражнымі і крупянымі, а таксама не дазваляецца замена пшаніцы ніякай іншай культурай.

10. Калгасы і аднаасобныя гаспадаркі павінны падвезьці і здаць на элеватары або прыстанцыйныя і прыстаньскія склады Загатзбожжа тую колькасьць збожжа, якая належыць з іх, в загатоўчыя органы павінны захаваць існуючую практыку разьлікаў са здатчыкам збожжа з улікам дальнасьці падвозу.

11. У залік выкананьня калгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі сваіх абавязацельстваў, устаноўленых гэтай пастановай па здачы збожжа дзяржаве, прымаецца толькі збожжа добраякаснае.

Тухлае і прарослае збожжа не залічваецца ў выкананьне абавязацельстваў калгасаў і аднаасобных гаспадарак.

Засьмечанае і сырое збожжа залічваецца ў выкананьне абавязацельстваў са скідкай на засьмечанасьць і вільготнасьць па стаўках устаноўленых Камітэтам Загатовак пры СНК СССР.

Абавязаць загадчыкаў элеватарамі і ссыпнымі пунктамі прыцягваць да судовай адказнасьці асоб, вінаватых у спробе здаць дзяржаве збожжа нядобраякаснае або сапсаванае збожжа.

12. Для снабжэньня хлебам па цьвёрдых дзяржаўных цэнах сельскіх настаўнікаў, аграномаў і мэдработнікаў устанавіць абавязковае налічэньне ў разьмеры 2 проц. ад норм, вызначаных гэтай пастановай.

Збожжа ў лік гэтых налічэньняў здаецца калгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі адначасова з выкананьнем імі сваіх абавязацельстваў па здачы збожжа, паступае на склады Загатзбожжа і расходуецца па распараджэньні раённых выканаўчых камітэтаў на аснове ўказаньняў СНК БССР выключна для снабжэньня настаўнікаў, аграномаў і мэдработнікаў.

13. Выкананьне ўстаноўленых гэтай пастановай абавязацельстваў па здачы збожжа дзяржаве зьяўляецца першачарговым абавязкам кожнага калгасу і аднаасобнай гаспадаркі і павінна быць зроблена з першых абмалотаў. Устанавіць, што калгасны гандаль збожжам будзе дазваляцца толькі пасьля выкананьня ўстаноўленага на аснове гэтай пастановы пляну збожжазагатовак у цэлым па рэспубліцы і поўнай сыпкі, пасьля выкананьня пляну збожжазагатовак, насенных фондаў.

14. Калгасы, якія ня выканалі сваіх абавязацельстваў па здачы збожжа дзяржаве ва ўстаноўленыя гэтай пастановай календарныя тэрміны, штрафуюцца праз сельскія саветы грашыма ў разьмеры рыначнага кошту ня выкананай часткі абавязацельстваў і апрача гэтага да гэтых калгасаў прад'яўляюцца патрабаваньні аб датэрміновым выкананьні ўсяго гадавога абавязацельства, якое павінна быць спагнана ў бясспрэчным парадку.

Аднаасобныя гаспадаркі, якія ня выканалі сваіх абавязацельстваў па здачы збожжа дзяржаве да ўстаноўленага гэтай пастановай тэрміну, прыцягваюцца да судовай адказнасьці паводле арт. 94. Крымінальнага Кодэкса БССР.

15. Бязумоўна забараняецца мясцовым органам улады і загатоўчым органам дапускаць сустрэчныя пляны або накладаць на калгасы і аднаасобныя гаспадаркі абавязацельствы па здачы збожжа, якія перавышаюць пагэктарныя нормы, устаноўленыя гэтым законам. Усе лішкі збожжа пасьля выкананьня абавязацельстваў па здачы дзяржаве збожжа застаюцца ў поўным распараджэньні саміх калгасаў, калгасьнікаў і аднаасобнікаў.

СТАРШЫНЯ САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР М. ГАЛАДЗЕД.

САКРАТАР ЦК КП(б)Б М. ГІКАЛО.

Аб правядзеньні раённых зьлётаў калгасьнікаў-ударнікаў лепшых калгасаў

Пастанова Цэнтрапасеўкому ад 25-II 33 г.

1. Склікаць з 7 па 10 сакавіка г. г. зьлёты калгасьнікаў-ударнікаў перадавых калгасаў.

Зацьвердзіць наступны парадак дню зьлётаў:

Даклад аб арганізацыі веснавой сяўбы і разгортваньні сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў калгасах.

2. Прапанаваць ГК і РК КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ, прафсаюзным і зямельным арганізацыям усю падрыхтоўку і зьлёты правесьці як шырокую масавую палітычную кампанію, якая-б абясьпечыла мабілізацыю калгасных мас на ажыцьцяўленьне пастаноў Пленуму ЦК УсеКП(б), прамовы т. Сталіна аб рабоце на вёсцы і пастаноў усесаюзнага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў,—на сапраўднае разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў кожным калгасе, брыгадзе і паміж калгасьнікамі, у справе лепшай арганізацыі веснавой сяўбы, на бязьлітасную барацьбу за захаваньне калгаснай і дзяржаўнай маёмасьці, супроць кулацкіх і клясава-варожых элементаў, гультаёў, дармаедаў і рвачоў.

3. Паказаць усім РК і ГК КП(б)Б, што на зьлёты абіраюцца лепшыя ўдарнікі калгасьнікі, галоўным чынам брыгадзіры, пераважна працуючыя непасрэдна на вытворчасьці і толькі перадавымі калгасамі, паказаўшымі лепшыя прыклады ў справе выкананьня сваіх абавязкаў перад дзяржавай, у падрыхтоўцы да веснавой сяўбы, укараненьня агразоатэхнікі, падвышэньня ўраджайнасьці і разьвіцьця жывёлагадоўлі, барацьбы за моцную калгасную дысцыпліну, захаваньне калгаснай маёмасьці і ачыстку ад кулацкіх і чужых элементаў.

4. Для кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеньнем зьлётаў зацьвердзіць палітычную камісію ЦК у складзе тт. Шаранговіча (старшыня) Рачыцкага (з заменай Рэвінскім), Картукова, Герцовіча (ЦК ЛКСМБ), Лецнэра і Лісковіча (ЦСПСБ).

5. Даручыць камісіі ЦК не пазьней 27-II устанавіць колькасьць дэлегатаў ад кожнага раёну, зацьвердзіць і разаслаць усім ГК і РК падрабязныя паказаньні аб правядзеньні масавай палітычнай работы, вызначыць канкрэтныя задачы для друку, прафсаюзаў, камсамолу, Дзяржвыдавецтва, Белдзяржкіно і інш. арганізацый, вырашыць фінансавае пытаньне, таксама падабраць і канчаткова зацьвердзіць упаўнаважаных ЦК на падрыхтоўцы да зьлётаў і дакладчыкаў па буйнейшых і найбольш важных раёнах. Дакладчыкамі па ўсіх іншых раёнах лічыць сакратароў РК.

6. Прапанаваць усім ГК і РК КП(б)Б не пазьней 27-II арганізаваць пры РК камісіі па падрыхтоўцы да зьлётаў у складзе: Зат. Аргаддзелам ГК, РК (старшыня), Зат. Райза, сакратара К-РК ЛКСМБ і ўпаўнаважанага ЦК, на якіх ускладаецца поўная адказнасьць за падрыхтоўку і арганізацыю зьлётаў.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГІКАЛО

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

Аб насеннай дапамозе калгасам і саўгасам Украіны Паўночнага Каўказу

Пастанова Савету Народных Камісараў Саюзу ССР і Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту УсеКП(б)

З прычыны таго, што няспрыюючыя кліматычныя ўмовы летам 1932 г. у радзе раёнаў Паўночнага Каўказа прывялі да страты часткі ўраджаю, у выніку чаго калгасы і саўгасы стэпавай паласы Украіны і некаторых раёнаў Паўночнага Каўказу (Кубань) не змаглі забясьпечыць сябе поўнасьцю насеньнем для веснавой сяўбы,—Саўнарком СССР і ЦК УсеКП(б) ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:

1. Адпусьціць з дзяржаўных запасаў зерня калгасам і саўгасам Украіны і Паўночнага Каўказу для насеннай пазыкі ў наступных разьмерах:

Па УКРАІНЕ 20 мільёнаў 300 тыс. пудоў, у тым ліку калгасам—18.600 тыс. пудоў.

Па ПАЎНОЧНЫМ КАЎКАЗЕ — 15.300 тыс. пудоў у тым ліку калгасам —12.400 тыс. пудоў.

2. Водпуск насеннай пазыкі вытварыць наступнымі культурамі:

Па Украіне	
Пшаніцы	5.250.000 п.
Авёс	6.000.000 п.
Ячмень	7.625.000 п.
Кукуруз	500.000 п.
Бабовыя	700.000 п.
Крупяныя	35.000 п.
Віка	190.000 п.
Па Паўночным Каўказе	
Пшаніцы	9.300.000 п.
Авёс	2.000.000 п.
Ячмень	3.300.000 п.
Кукуруза	700.000 п.
Бабовыя	—
Крупяныя	—
Віка	—

3. Насенную пазыку адпусьціць бес процантна з абавязковым зваротам на тураю увосень 1933 г. прычым адміністрацыйныя і транспартныя выдаткі дзяржавы налічваць пры звароце насеннай пазыкі ў разьмеры 10 пудоў на кожныя 100 пудоў адпушчанай насепазыкі.

4. Абавязаць савецкія і партыйныя арганізацыі Украіны і Паўночнага Каўказу забясьпечыць правільнае разьмеркаваньне адпушчанай дзяржавай пазыкі па раёнах, калгасах і саўгасах..

5. Абавязаць савецкія і партыйныя арганізацыі Украіны і Паўночнага Каўказу мабілізаваць усе насенныя рэсурсы ў калгасах і саўгасах для забесьпячэньня поўнасьцю насеньнем праддстаячай веснавой пасеўнай кампаніі.

СТАРШЫНЯ САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ САЮЗА ССР
В. МОЛАТАЎ (Скрабін)

САКРАТАР ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТУ УсеКП(б)
І. СТАЛІН.

25 лютага 1933 г

Аб ходзе падрыхтоўкі да сяўбы па Аршанскім, Сеньненскім, Быхаўскім Барысаўскім і Смалявіцкім раёнах

Пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР

1. ЦК і СНК канстатуюць, што падрыхтоўка ва ўказаных раёнах вядзецца нездавальняюча, адсутнічае аперацыйнае кіраўніцтва з боку раённых арганізацый, у прыватнасьці каляндарны плян падрыхтоўкі да сяўбы; у МТС пануе безгаспадарчасьць, калгасныя масы не мабілізаваны на падрыхтоўку да сяўбы і г. д.

2. ЦК і СНК лічаць агідным факты зьніжэньня пасеўных плянаў: па СЕНЬНЕНСКІМ раёне — на 1400 га, па АРШАНСКІМ — зьніжэньне пасеваў збожжавых культур на 900 га, з іх пшаніцы на 200 га, па БЫХАЎСКІМ раёне—на 2143 га.

ЦК і СНК абвяшчаюць вымову: сакратарам — СЕНЬНЕНСКАГА РК тав. ДАШУКЕВІЧУ, АРШАНСКАГА—ЧАРНЫШОВУ, СТАРШЫНЯМ РВК—СЯБЕСЕВІЧУ І ВАЛАСЕВІЧУ; загадчыкам райза — МАСЬЛЯНЬНІКАВУ і ЖЫЛІНСКАМУ, суровую вымову загадчыку БЫХАЎСКАГА РАЙЗА—КУЧАРАВУ, які зьнізіў плян пасеву збожжавых культур.

Паставіць на від сакратару БЫХАЎСКАГА РАЁНУ тав. КАНАВАЛАВУ і СТАРШЫНІ РВК тав. ГРЫНКЕВІЧУ за адсутнасьць кантролю над разьверсткай пасеўных плянаў.

Прапанаваць указаным раёнам у аднадзённы тэрмін правесьці разьвёрстку пасеўных плянаў, згодна пляну НКЗБ.

Папярэдзіць сакратароў РК, старшынь РВК і загадчыкаў Райза ўсіх астатніх раёнаў, што ўсякія спробы парушыць плян, паданы НКЗ у бок паменшэньня, перамяшчэньня па культурах і па сэктарох — будуць разглядацца, як спробы зрыву веснавой сяўбы і вінаватыя ў гэтым будуць прыцягвацца да суровай партыйнай адказнасьці, аж да выключэньня з партыі.

3. ЦК і СНК канстатуюць наяўнасьць злачыннай безгаспадарчасьці ў Барысаўскай МТС (жняяркі ляжаць усю зіму пад сьнегам), Сеньненскай МТС (інвэнтар і с. г. машыны засыпаны сьнегам), Смалявіцкай (новыя плугі не сабраны).

Такія-ж злачынныя адносіны да інвэнтару ёсьць і па раду калгасаў, якія абслугоўваюцца гэтымі МТС.

Абвясьціць вымову дырэктарам: Барысаўскай МТС — тав. ХОЛМІЧУ, Сеньненскай — тав. ПАБОРЦАВУ, Смалявіцкай — тав. ЛОМСКАМУ і абавязаць райкомы КП(б)Б дадаткова абсьледаваць становішча гэтых МТС і пакараць самым жорсткім чынам канкрэтных вінаватых у шкодніцкіх адносінах да с. г. інвэнтару.

4. ЦК і СНК адзначаюць, што па цэлым радзе калгасаў гэтых раёнаў, асабліва па Смалявіцкім, пануе злачынная безгаспадарчасьць (мерзьне і гіне бульба, прэе збожжа, злачынны догляд коняй, адсутнічае ўлік насеньня і фуражу і кантроль за іх расходаваньнем і г. д.), якая зьяўляецца простым вынікам засьмечанасьці калгасаў кулацка - заможнымі элементамі, якія вядуць шкодніцкую работу. ЦК і СНК прапануюць Аршанскаму райкому і РВК неадкладна праверыць склад калгасу «Пралетары», Барысаўскаму—калгас «Чыгуначнік», Смалявіцкаму—калгасаў «Прагрэс», «Орка», «Зьвязда», прыцягнуўшы вінаватых у падзежы коняй, гніеньні бульбы, разбазарваньні фуражу і інш. да судовай адказнасьці на падставе закону аб ахове грамадзкай уласнасьці, ачысьціць гэтыя калгасы ад кулацка-заможных элементаў і аб прынятых мерах у дэкадны тэрмін паведаміць ЦК і СНК.

Зьвярнуць увагу ўсіх райкомаў, РВК, дырэктароў МТС, сельскіх ячэек і сельсаветаў на неабходнасьць узмацненьня барацьбы за ачыстку калгасаў ад кулакоў і інш. антысавецкіх элементаў, якія пралезьлі ў калгасы і занялі там месцы рахункаводаў, кладаўшчыкоў, конюхаў і г. д.

5. ЦК і СНК прапануюць РК, РВК, і РАЙЗА неадкладна выпрацаваць каляндарны тэрмін асноўных работ у падрыхтоўцы да сяўбы: па-першае, сканчэньня ачысткі насеньня; па-другое, рамонту сельска-гаспадарчага інвэнтару, па-трэцяе, складаньне вытворчых плянаў у калгасах і арганізацыі сталых брыгад; па-чацьвёртае, падрыхтоўкі калгасных кадраў; па-пятае, вывазу мінугнаеньня, гною і г. д.

ЦК і СНК лічаць недапушчальным такое становішча, калі пасеўныя пляны да гэтага часу яшчэ не абгавораны ў калгасах і ў прыватнасьці з калгасным актывам і зноў падкрэсьлівае неабходнасьць прыцягненьня калгаснага актыву да практычнага праздзеньня ўказаных мерапрыемстваў.

Малейшае праяўленьне самацёку ў падрыхтоўцы да сяўбы выкарыстоўваецца клясавым ворагам для арганізацыі сабатажу. ЦК і СНК падкрэсьліваюць таму, неабходнасьць штодзённага, канкрэтнага кіраўніцтва падрыхтоўкай да сяўбы ў кожным саўгасе і калгасе.

6. Гэтую пастанову апублікаваць у друку.

Зводка аб ходзе рамонту трактароў і трактарных плугоў па МТС БССР

на 25 лютага 1933 г.

Назва МТС	Трактароў: План	Трактароў: Адрамантавана	Плугоў тракт.: План	Плугоў тракт.: Адрамантавана
I. Лёнамалочныя раёны				
Дрысенская	21	18	28	25
Талочынская	14	11	30	11
Ушацкая	20	14	23	20
Ветрынская	29	20	30	24
Асьвейская	30	20	29	16
Лепельская	41	26	48	31
Лёзьвенская	41	20	51	26
Барковіцкая	23	10	21	18
Сіроцінская	30	12	35	34
Дубровенская	40	15	44	32
Расонская	30	10	35	24
Чашніцкая	22	7	22	11
Горацкая	38	11	44	30
Севенская	32	7	42	26
Бялыніцкая	27	4	45	21
Гарадоцкая	29	3	34	23
Крупская	11	1	12	10
Бешанковіцкая	29	2	29	25
Шклоўская	40	2	56	41
Мсьціслаўская	39	1	40	27
Сураская	26	—	30	12
Чавуская	11	—	28	28
Усяго па Лёна-трактарацэнтру	623	214	756	515
II. Зерня трактарацэнтр				
Слуцкая	32	27	59	28
Капыльская	28	23	30	12
Тавежыцкая	30	20	44	20
Лагойская	20	11	24	18
Старобінская	15	7	20	14
Д[illegible]навіцкая	30	13	37	20
Ж[illegible]тквавіцкая	21	9	39	18
Стара-Дароская	31	13	42	21
Тураўская	10	4	16	10
Плешчаніцкая	20	7	21	15
Бягомльская	20	6	20	5
Вузьдзенская	20	6	22	9
Пухавіцкая	24	5	40	24
Лельчыцкая	15	3	15	8
Хойніцкая	26	—	14	14
Усяго па зерня-трактарацэнтру	342	154	443	236
III. Гароды бульб трактарацэнтр				
Буда-Кашалеўская	21	21	34	18
Жлобінская	17	11	26	11
Менская	27	17	34	25
Аршанская	26	15	28	28
Віцебская	11	6	22	11
Клімавіцкая	40	21	31	19
Заслаўская	26	13	26	25
Касьцюковіцкая	16	8	42	19
Дзяржынская	46	22	42	—
Цэрахоўская	33	12	45	19
Полацкая	24	8	32	21
Смалявіцкая	40	12	40	34
Целуская	22	6	30	26
Магілеўская	24	6	25	18
Рагачэўская	29	7	32	11
Бальшавіцкая	20	4	24	16
Путчынская	17	3	17	—
Гомельская	16	2	20	2
Рэчыцкая	24	3	33	26
Барысаўская	24	3	36	23
Крычаўская	6	—	6	—
Усяго па гародн.-бульб. трактарацэнтрах	508	200	617	352
Усяго па трактарацэнтрах	1473	568	1816	1003

Пленум аргкамітэту саюзу савецкіх пісьменьнікаў БССР

Адкрыцьцё пленуму

24 лютага а 9-й гадзіне ўвечары зала Польскага Дзяржаўнага Тэатру запаўняецца дэлегатамі пленуму. На адкрыцьцё першага пашыранага пленуму Саюзу Савецкіх пісьменьнікаў БССР прыйшлі прадстаўнікі партыйнай і савецкай грамадзкасьці, рабочыя ўдарнікі, прафэсура, студэнцтва.

Пленум адкрыўся ўступнай прамовай старшыні аргкамітэту Саюзу Савецкіх пісьменьнікаў БССР тав. М. КЛІМКОВІЧА.

— Прайшоў амаль год,—гаворыць тав. Клімковіч з таго часу, як ЦК партыі вынес гістарычную пастанову аб перабудове пісьменьніцкіх арганізацый, у мэтах прыцягненьня найшырэйшых колаў савецкіх пісьменьнікаў да актыўнага ўдзелу ў пабудове бясклясавага грамадзтва. Гэты час вызначаецца надзвычайным ростам палітычнай і творчай актыўнасьці пісьменьнікаў. Але задачы, якія пастаўлены пры пераходзе да пабудовы бясклясавага грамадзтва,—вельмі складаныя і вялізарныя. У сьвятле гэтых задач пісьменьнікамі зроблена яшчэ мала.

Гаворачы аб задачах пленуму, тав. Клімковіч падкрэсьліў яшчэ наліччы рэштак групаўшчыны сярод пісьменьнікаў, якія трэба да канца зжыць, не абходзячы наданьня асаблівае ўвагі становішчу марксыцка-ленінскай крытыкі, бальшавіцкага разгортваньня самакрытыкі ў літаратурных арганізацыях.

Самае галоўнае—гэта высокая клясавая пільнасьць, гэта рашучая барацьба з малейшымі спробамі клясава-варожых вылазак, рашучы адпор малейшым спробам рэваншу з боку клясавага ворага ў літаратуры, які скарыстоўвае ўсякую шчыліну, каб шкодзіць пасьпяховаму сацыялістычнаму наступу.

У прэзыдыум пленуму аднагалосна абраны т. т.: Жаброўскі, Ляўкоў, Кірпоцін, Платун, Брагінскі, Ляхаў, Таарыч, Ал. Некрашэвіч, Янка Купала, Якуб Колас. Александровіч, Харык, Галавач, Чарот, Кобец, Бэндэ, Дварчанін, Дунец, Самахвалаў, Кацнэльсон, Эрмлер, Броўка, Гараўскі, Шаўцоў, Звонак, Домбаль і інш.

Пад бурныя апплёдысмэнты абіраецца ганаровы прэзыдыум у складзе: палітбюро ЦК УсеКП(б) на чале з тав. Сталіным, бюро ЦК КП(б)Б на чале з тав. Гікало, т. т. Тэльман, Ленскі, Корчык, Постышаў, Стэцкі, Гронскі, Максім Горкі, Серафімовіч.

У рэдкалегію пленума абраны т. т. Модэль, Ліхадзіеўскі, Знаёмы.

Абвестка дню пленуму: Сучаснае становішча беларускай савецкай літаратуры і задачы ССПБ—даклад т. КЛІМКОВІЧА; творчыя пытаньні—даклады т. т. БРОНШТЭЙНА і ЛІМАНОЎСКАГА; даклад кіно-фабрыкі «Савецкая Беларусь»—даклад дырэктара фабрыкі тав. Канцэльсона.

На ўрачыстым паседжаньні пленуму 24 увечары, з вялікай прывітальнай прамовай ад Усесаюзнага камітэту Саюзу Савецкіх пісьменьнікаў выступіў спатканы працяжнымі і воплескамі адказны сакратар яго—тав. Кірпоцін:

Прамова тав. Карпцціна

— Прывітаньне савецкім пісьменьнікам Беларусі! Прывітаньне брацкім пісьменьнікам, якія сабраліся ў гэтай залі, якія з гонарам выконваюць задачы сацыялістычнага будаўніцтва сілаю мастацкага слова! Прывітаньне ад пісьменьнікаў Масквы, ад пісьменьнікаў РСФСР, ад пісьменьнікаў усяго Савецкага саюзу.

Пастанова ЦК УсеКП(б) ад 23 красавіка мінулага году пра перабудову работы літаратурных арганізацый,—адзначае тав. Кірпоцін, — была выклікана паваротам у бок савецкай улады, у бок пралетарыяту большасьці лепшых кадраў савецкай інтэлігенцыі, большасьці лепшых, найбольш таленавітых, найбольш здаровых пісьменьнікаў Савецкага саюзу.

На аснове выкананьня пастановы Цэнтральнага Камітэту ад 23 красавіка мы дабіліся вялізарнейшых посьпехаў у справе перамаганьня групаўшчыны, замкнутасьці, адарванасьці паасобных атрадаў і груп пісьменьнікаў паміж сабой. На аснове пастановы ЦК, на аснове выкананьня лініі партыі мы дабіліся зараз найлепшых сапраўдных умоў для наладжаньня правільных узаемаадносін паміж пісьменьнікамі-камуністамі і іншымі атрадамі савецкіх пісьменьнікаў.

Тав. Кірпоцін прыводзіць словы тав. СТАЛІНА з яго апошняй прамовы на зьезьдзе калгасьнікаў - ударнікаў аб тым, што «сіла бальшавікоў, сіла камуністаў заключаецца ў тым, што яны ўмеюць акружаць нашу партыю мільёнамі беспартыйнага актыву» і падкрэсьлівае, што наладжаньне нармальных адносін паміж пісьменьнікамі-камуністамі і пісьменьнікамі беспартыйнымі мае месца ў асяродзішчы беларускай пісьменьніцкай грамадзкасьці. Якім доказам гэтага, — кажа тав. Кірпоцін, — зьяўляецца выступленьні на пленуме ўсесаюзнага аргкамітэту ў Маскве народнага паэта Янкі Купалы. Ён выступіў з указаньнем таго, што прыносіць свой творчы талент, сваё ўменьне, сваё майстэрства паэта на службу сацыялізму. І той прыём, які быў яму аказан, тыя авацыі, якія раздаліся па адрасу слаўных беларускіх пісьменьнікаў, былі доказам тае мовы ўзаемнага разуменьня, якім аблягчаецца выкананьне пастановы ЦК.

Тав. Кірпоцін робіць аналіз вылазкам клясавага ворага на літаратурным фронце на прыкладах рускай літаратуры, і ў прыватнасьці на вылазках Сідарэнкі, Нікановіча і Баранавых у беларускай літаратуры. Але я ўпэўнен —кажа тав. Кірпоцін,—што мы на базе таго вялізарнага згуртаваньня, таго вялізарнага яднаньня, якое стварылася паміж пісьменьнікамі- камуністамі і савецкімі пісьменьнікамі-беспартыйнымі, на базе вялізарнага павароту ўсяго лепшага, што ёсьць у мастацкай літаратуры ў Беларусі, РСФСР, ва ўсім Саюзе, мы здолеем перамагчы і да канца дабіць рэшткі варожых выступленьняў, для таго, каб стварыць сацыялістычную літаратуру.

Беларусь, якая раней усяляк ганьбавался пануючымі клясамі, разглядалася імі, як аб'ект эксплёатацыі і ўціску з боку памешчыкаў і капіталістаў, у савецкіх умовах, ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту выявіла вялізарны творчы рост у галіне эканомікі, культуры, у прыватнасьці мастацкай літаратуры. Лепшыя творы беларускіх пісьменьнікаў становяцца тожамі, якія ведаюць усе народы Савецкага саюзу. У гэтым годзе ў Маскве падрыхтоўваецца пераклад лепшых твораў беларускіх пісьменьнікаў. Бязумоўна, гэта яшчэ далёка ня ўсё, што трэба зрабіць і мы павінны яшчэ больш узмацняць і шырыць гэту нашу брацкую сувязь.

Ніколі яшчэ раней літаратура і мастацтва, — указвае далей тав. Кірпоцін,—ня мелі такіх умоў для свайго росту, як ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту, як ва ўмовах Савецкага саюзу. Ні адна кляса немагла аддаваць столькі ўвагі, столькі клопатаў, колькі аказвае рабочая кляса і камуністычная партыя свайму мастацтву, сваёй літаратуры. Вы ведаеце, што пытаньнямі мастацкай літаратуры займаецца і ЦК камуністычнай партыі на чале з тав. Сталіным. займаецца ЦК КП(б)Б, што мастацкай літаратурай займаецца пралетарыят і працоўныя ўсяго Савецкага саюзу.

Савецкая мастацкая літаратура — гэта вялізарная сіла, якая выхоўвае і загартоўвае масы будаўнікоў сацыялізму, якая дапамагае чалавеку скінуць з сябе рэшткі ўласьніцкай псыхалёгіі, дапамагае яму змагацца за сацыялізм.

Рэжысэр Ленінградзкай кіно-фабрыкі «Савецкая Беларусь» Ю. Тарыч у сваім прывітальным выступленьні выказаў упэўненасьць, што пленум паложыць пачатак сыстэматычнай, сур'ёзнай работы беларускіх савецкіх пісьменьнікаў у кіно-прамысловасьці, работы на якую дагэтуль не звярталася належнай увагі.

Прывітаньне ад рэвалюцыйных пісьменьнікаў Заходняй Беларусі перадаў пленуму тав. Дварчанін. У цікавай прамове тав. Дварчанін расказаў пленуму аб тым дзікім сацыяльным і нацыянальным уціску, якія чыняць польскія фашысты ў Заходняй Беларусі.

Пасьля ўрачыстай ачасткі з дакладам аб сучасным становішчы беларускай савецкай літаратуры і задачах ССПБ выступіў старшыня аргкамітэту М. Клімковіч.

Вынікі перамог сацыялізму

Тав. Клімковіч адзначыў у сваім дакладзе, што рост беларускай літаратуры—прамы вынік нашага агульнага гаспадарчага і культурнага росту, перамог сацыялізму, вынік нашых агульных посьпехаў, якія заваёваны ў жорсткай барацьбе з клясавым ворагам.

Радам фактаў і лічбаў дакладчык паказаў вялікі размах нацыянальна-культурнага будаўніцтва, вялізны культурны рост раней няпісьменнай падкалёніяльнай царскай краіны, якая пры дыктатуры пралетарыяту перат ворана ў краіну суцэльнай пісьменнасьці. За 4 гады да першай пяцігодкі было выдадзена 791 назва. За першую пяцігодку выдавецкая работа пашырылася да 4035 назваў. Кошт кніжнай прадукцыі першай пяцігодкі складае 13 млн. руб. У рэспубліцы налічваецца 1600 кіноўстановак. Выдаецца 64 раённых газэты, 30 часопісаў, звыш 1000 шматтыражак.

Контррэвалюцыйная тэорыя Троцкага аб тым, што пэрыяд дыктатуры пралетарыяту ня можа быць пэрыядам будаўніцтва пралетарскай культуры—ушчэнт разьбіта. Разьбіта ўшчэнт і тэорыя правых апартуністаў аб немагчымасьці для рабочых і сялян авалодаць тэхнікай і культурай у такіх разьмерах, якіх мы дасягнулі за першую пяцігодку.

У сваім дакладзе тав. Клімковіч дэталёва спыніўся на абвостранай клясавай барацьбы на фроце літаратуры і мастацтва. барацьбы, якая зьяўляецца вынікам клясавай барацьбы у краіне, вынікам кулацкага сабатажу. Клясавы вораг імкнуўся і будзе імкнуцца пралезьці ў літаратуру і мастацтва, каб з гэтага вучастку праводзіць сваю контррэвалюцыйную работу.

Зрабіўшы падрабязны разгляд контррэвалюцыйных нацдэмаўскіх вылазак на розных этапах сацыялістычнага будаўніцтва, тав. Клімковіч падрабязна застанавіўся на клясава-варожых, нацдэмаўскіх вылазках Сідарэнкі-Пеначкіна, Нікановіча, Баранавых і ім падобных.

Далей тав. Клімковіч застанавіўся на тых значных дасягненьнях, якія зьяўляюцца вынікам ажыцьцяўленьня пастановы ЦК УсеКП(б) ад 23 красавіка і адпаведных пастаноў ЦК КП(б)Б пра перабудову пісьменьніцкіх арганізацый. Тав. Клімковіч падкрэсьліў рост пісьменьнікаў Кузьмы Чорнага («Бацькаўшчына»), Крапівы («Мядзьведзічы»), даў аналіз новых твораў беларускіх пралетарскіх пісьменьнікаў з моладзі. Разам з тым тав. Клімковіч падкрэсьліў рост савецка-нацыянальнай літаратуры—яўрэйскай польскай і інш.

Недастатковая барацьба з групоўшчынай, недастатковая кансалідацыя партыйна-камсамольскай вядучай часткі арганізацыі, зусім слаба пастаўлена палітычнае выхаваньне, неналаджаньне творчай вучобы пісьменьнікаў, зусім слабая работа з ударнікамі, якія закліканы ў літаратуру,—недастатковая клясавае пільнасьць вось асноўныя палітычныя памылкі ў рабоце аргкамітэту. Нам трэба кажа тав. Клімковіч у самы бліжэйшы час перабудаваць сваю работу, каб пісьменьніцкая арганізацыя па бальшавіцку дапамагла партыі ў яе вялізарнай рабоце па будаўніцтве сацыялізму.

Быць яшчэ больш пільнымі да клясавага ворага, нацэляваць усе сілы савецкай літаратуры, пад кіраўніцтвам партыі, на пасьпяховае выкананьне палітычных задач другой пяцігодкі. Асноўнай праграмай кожнага пісьменьніка зрабіць праграмныя выступленьні тав. Сталіна на пленуме ЦК і ЦКК, на зьезьдзе калгасьнікаў-ударнікаў.

Пас джаньні 25 лютага

Паседжаньне пленуму 25 раніцай было занята дакладамі аб творчых пытаньнях т. т. Бронштэйна і Ліманоўскага. Тав. Бронштэйн даў малюнак стану і творчых мэтадаў літаратуры. Тав. Ліманоўскі даў разбор творчасьцяй пісьменьнікаў Кузьмы Чорнага і М. Зарэцкага.

На вячэрнім паседжаньні 25 адбыліся спрэчкі па зробленых дакладах. У спрэчках выступілі:

Тав. Сабаленка (Гомель), які гаварыў аб неабходнасьці павялічэньня ўвагі да пэрыфэрыйных філій. Тав. Сабаленка прывёў прыклад, што ў бібліятэцы імя Чарнышэўскага беларуская кніга займае ўсяго 5 проц. з іх палова перакладных. Бібліятэчныя працаўнікі баяцца нацыянал дэмакратызму і шарахаюцца ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму. Філія ў Гомелі ў заняпадзе. Літгурткі на прадпрыемствах не працуюць.

Перкоўскі (Клімавічы). Творчы актыў 30-50 чалавек. Заклікана ў літаратуру 150 ударнікаў. Партыйныя арганізацый мала зьвяртаюць увагі на работу Філіі. Былі выпадкі клясава-варожых вылазак у творчасьці пісьменьнікаў і нізавым друку.

Кавалёў гаворыць аб дзіцячай літаратуры. Дзіцячай літаратуры ў нас няма ўвагі. Калі ня лічыць Якімовіча, кніжкі Шыдлоўскага «Ля граніцы» і яшчэ 3—4-х кніжак, то больш мы нічога ня маем на фронце дзіцячай літаратуры.

Шапіра (Дом чырвонай арміі) прысьвяціў сваё выступленьне абароннай тэматыцы. Пісьменьнікі БССР не выпаўнілі сацыялістычны рахунак Чырвонай арміі. Камандзіры, якія разьбіраюцца у пытаньнях літаратуры, гавораць, што ў літаратуры зусім няма Чырвонай арміі.

Люгоўскі (Віцебск) гаворыць. што характэрнейшай рысай філіі зьяўляецца работа сярод ударнікаў. На прадпрыемствах працуюць 7 літгурткоў.

Вольны гаворыць аб неабходнасьці больш удзяляць увагі пачынаючым пісьменьнікам.

Цішка Гартны ў сваім выступленьні застанавіўся на пытаньнях групаўшчыны. крытыкі, перабудовы работы пісьменьніцкіх арганізацый на аснове пастановы ЦК ад 23 красавіка, на пытаньнях дзіцячай літаратуры і клясава варожых выступленьнях на фронце літаратуры і мастацтва.

Маур гаварыў аб неабходнасьці павялічыць увагу да пытаньняў дзіцячай літаратуры.

Дудар свае выступленьне прысьвяціў клясава варожым выступленьням ў літаратуры і мастацтве, застанавіўся на сваіх нацдэмаўскіх памылках і не абходнасьці узьняцца клясавай пільнасьці.

Пра ліквідацыю множнасьці і паралельнасьці ў абследваньні земорганаў

Пастанова прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б і калегі НК РСІ Бел. ад 19-ІІ 33 г.

Прэзыдыум ЦКК і Калегія НК-РСІ адзначаюць, што ў апошні час, у сувязі з падрыхтоўкай да веснавой пасеўнай кампаніі зямельныя органы падпадаюць непарыўнаму абсьледваньню з боку розных арганізацый, парушаючы нармальную іх работу.

У мэтах ліквідацыі множнасьці і паралельнасьці ў абсьледваньні цэнтральных зямельных органаў—забараняецца ўсім савецкім, гаспадарчым, каапэрацыйным, прафэсіянальным і грамадзкім арганізацыям праводзіць усякія кантрольна-праверачныя работы і збор усякіх зьвестак па ўстановах гор. Менску, без дазволу ЦКК-РСІ і Гар. КК-РСІ.

Прапанаваць кіраўнікам зямельных органаў—НКЗ, НКСаўгасаў, трэстаў і інш. арганізацый не дапускаць да абсьледваньня ніякіх арганізацый бяз візы ЦКК-РСІ і Гар. КК-РСІ, за выключэньнем дырэктыўных органаў, якім арганізацыі, што правяраюцца непасрэдна падпарадкаваны.

Ускласьці рэгуляваньне кантрольна-абсьледвальнай работы па гор. Менску на Сел. Гасп. групу ЦКК і на члена прэзыдыуму Гар. КК па яе прызначэньні.

Пастанову апублікаваць у друку.
Старшыня ЦКК КП(б)Б Нарком РСІ-Бел. ЛЫЧОЎ.

Падрыхтаваць каня да сяўбы

У калгасе «Новы быт», Славенскага сельсавету, у доглядзе за коньмі панує абязьлічка. Конюхі да коняй не прымацаваны.

З гэтай прычыны пояцца і кормяцца коні несваячасова. Корм кідаецца пpo ста пад ногі.

Праўленьне калгасу ня цікавіцца справай догляду коняй. Такое становішча трэба неадкладна ліквідаваць. Конь вырашае пасьпяховае правядзеньне сяўбы, а таму злачынным, нядбайным адносінам да коняй трэба абвясьціць самую рашучую барацьбу.

Падрыхтаваць каня да сяўбы—баявая задача.

Міхась Лынькоў

Аб нашым літаратурным фронце

Калі даваць кароткую характарыстыку літаратуры і мастацтву ўсяго Савецкага Саюзу, дык мы не дапусьцім ні малейшай памылкі, калі скажам, што САВЕЦКАЯ ЛІТАРАТУРА, САВЕЦКАЕ МАСТАЦТВА ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА САМЫМ ЛЕПШЫМ, ЖЫВЫМ, СЬВЕТЛЫМ, ЦІКАВЫМ, НАЙБОЛЬШ ІДЭЙНА - НАСЫЧАНЫМ, САМЫМ ПЕРАДАВЫМ СЯРОД ЛІТАРАТУРНА - МАСТАЦКАЕ ПРАДУКЦЫІ ЎСЯГО СЬВЕТУ. І гэта ўпаўне зразумела. Інакш быць ня можа. «Калі рушацца сьцены, тады гібнуць самыя найлепшыя абоі», так гаворыць адзін нямецкі фэльетаніст, пішучы аб заняпадзе культуры ў Нямеччыне. А сьцены трашчаць, рушацца па ўсім капіталістычным сьвеце, які залез у бязвыхадныя і безнадзейныя тупікі жорсткага крызісу.

Ва ўмовах заняпаду, дэградацыі капіталістычнае гаспадаркі ў такія-ж безпрасьветныя тупікі трапіла і буржуазная культура, якая здольна цяпер хіба толькі эпігонстваваць, а не ствараць нешта новае, хвалюючае, што змагло-б павесьці за сабой думкі і пачуцьці найлепшых прадстаўнікоў чалавечага розуму і шырокіх мас працоўных. І хіба мы не назіраем сваеасаблівага адраджэньня сярэднявякоўя ў буржуазнай культуры: яе заняпаду, росквіту містыкі папоўшчыны, ідэалізму, змаганьня з дарвінізмам, змаганьне з матэрыялізмам ва ўсіх галінах «духоўнае вытворчасьці» і г. д. і да т. п.

У буржуазнай літаратуры пры характэрнай для яе заалегічнай нянавісьці да рабочай клясы, да Савецкага Саюзу, мы маем агульны ўпаднічкі тон, поўную безнадзейнасьць, беспраблемнасьць, спустошанасьць, самую выразную нікчэмнасьць. Найбольш выразнай ілюстрацыяй гэтага могуць быць творы такіх буржуазных пісьменьнікаў, як Марсэля, Пруста, Джона Голсуорсі і іншых пявуноў надзей і чаканьняў буржуазіі, яе спустошанага існаваньня, пявуноў, якія ставіцца на калені перад чалавекам—уласьнікам, які для іх «сьвятая сьвятых».

Хіба могуць яны стварыць манумэнтальныя творы, хіба могуць яны даць высока-ідэйнае мастацкае слова, калі іхняе «сьвятое сьвятых» разгромлена ў прах няўмольным ходам гістарычных падзей, непераможным ходам пралетарскай рэвалюцыі.

Я ўжо не кажу, аб так званай бульварнай літаратуры, насычанай густой містыкай, безнадзейнасьцю, часам самым брудным гомосэксуалізмам, агалёнай эротыкай.

Можна-б было прывесьці яскравыя прыклады ідэалёгічнай дэмагогіі буржуазнай літаратуры, выпадкі падыгрываньня пад рабочыя інтарэсы, спэкуляцыі на сумленнасьць рабочай клясы, маскаваньня пад абаронцаў пралетарскіх інтарэсаў, — усе тыя зьявы якія аналёгічны палітычнай дэмагогіі сацыял-фашысцкіх партый.

Усё прагрэсыўнае, усё найлепшае, што мы маем у заходня-эўрапейскай і амэрыканскай літаратуры, гэта тое, што нараджаецца ў барацьбе з буржуазіяй, у барацьбе з сусьветным капіталізмам. Мы можам аднесьці сюды такіх пісьменьнікаў, як Ромэн Ролана, Анры Барбюса, Тэадора Драйзэра, Бэрнарда Шоў, Бэхера, Фрыдрыха Вольфа і рад другіх, якія рашуча выступаюць супроць сусьветных драпежнікаў, супроць капіталістычнага ладу, выступаюць у абарону Савецкага Саюзу, актыўна дапамагаюць у стварэньні адзінага пралетарскага фронту. І якім шалёным наскокам, брудным паклёпам падвяргаюцца гэтыя найлепшыя імёны з боку буржуазіі і яе прыслужнікаў.

Разам з літаратурай усяго Савецкага Саюзу, у шчыльным яднаньні з літаратурай усіх брацкіх рэспублік, жыве і разьвіваецца савецкая літаратура БССР. Гэты рост стаў асабліва прыкметны пасьля гістарычных пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб перабудове літаратурна - мастацкіх арганізацый, у тым ліку і БелАПП-а. Белапаўская арганізацыя, правёўшая ў свой час пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі пасьпяховую барацьбу з контррэвалюцыйным беларускім нацыянал - дэмакратызмам, з вяліка дзяржаўным расійскім шавінізмам і іншымі варожымі ўплывамі, тэорыямі і тэорыйкамі на літаратурным фронце, зконсалідаваўшая асноўныя пралетарскія сілы ў літаратуры, на апошнім этапе свайго існаваньня пачалаператварацца «з сродку найбольшай мабілізацыі савецкіх пісьменьнікаў і мастакоў наваколл задач сацыялістычнага будаўніцтва ў сродак культываваньня гуртковай замкнёнасьці», з адрывам «ад палітычных задач сучаснасьці і ад значных груп пісьменьнікаў і мастакоў, спачуваючых сацыялістычнаму будаўніцтву» (З пастановы ЦК УсеКП(б) ад 23 красавіка 1932 года).

БелАПП, як і іншыя воаппаўскія арганізацыі, ня ўлічылі новых умоў і абставін, ня ўлічылі павароту асноўнай масы пісьменьнікаў да партыі і савецкай улады. Павароту, абумоўленага рашаючымі-глыбокімі працэсамі ў эканоміцы і палітыцы краіны, абумоўленага рэальнымі посьпехамі генэральнага пляну сацыялістычнага будаўніцтва, рэальнымі перамогамі пралетарыяту ў клясавай барацьбе, рэальнымі дасягненьнямі партыі непасрэдна ў галіне літаратуры, да якіх можна аднесьці бязумоўны рост і дасягненьні пралетарскай літаратуры, рост яе кадраў, яе ідэёва-вядучай ролі ва ўсёй савецкай літаратуры.

БелАПП не заўважыў гэтага павароту, а калі і заўважыў, дык не зрабіў належных вывадаў.

Патрэбныя вывады зрабіў ЦК КП(б)Б, зьняўшы тормазы з працэсу перабудовы пісьменьніцкай арганізацыі.

Як-жа сустрэла пісьменьніцкая грамадзкасьць і чым яна адказала на гістарычныя пастановы партыі?

Сустрэла і ацаніла, як выключныя па свайму палітычнаму значэньню дакументы, якія адкрываюць найвялікшыя пэрспэктывы і магчымасьці для сапраўднай глыбокай творчасьці кожнага савецкага пісьменьніка, магчымасьць актыўнага непасрэднага ўдзелу ў стварэньні новага сьвету, у змаганьні за бясклясавае сацыялістычнае грамадзтва.

Праўда, былі паасобныя галасы з тымі ці іншымі рэваншысцкімі нюансамі, былі паасобныя выпадкі недастковага разуменьня сутнасьці пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, выпадкі разгубленасьці, часовай страты пэрспэктыў у некаторых таварышоў, але ўсё гэта ні ў якім разе не парушала агульнага ідэёва-творчага ўздыму асноўных пісьменьніцкіх мас, сярод якіх мы маем у наяўнасьці сапраўднае творчае ажыўленьне. Большасьць пісьменьнікаў працуюць над новымі творамі, сярод гэтых твораў ня мала буйных палотнаў.

Што новага, характэрнага бачым мы на сёньняшні дзень у творчасьці наных пісьменьнікаў? Гэта, у першую чаргу, пашырэньне тэматыкі. Ад культавага бытавізму, ад абмежаванай вясковай тэматыкі аднаўленчага пэрыяду, ад тэматыкі грамадзянскай вайны (тэматыкі, да рэчы, не распрацаванай яшчэ як сьлед і да гэтага часу) пісьменьнікі пераходзяць да больш шырокіх палотнаў рэканструкцыйнай тэматыкі: —сацыялістычная прамысловасьць, калектывізацыя сельскай гаспадаркі, рэканструкцыя транспарту, пытаньні абароны краіны, нацыянальная палітыка і г. д. Прычым, творы пішуцца на больш высокім ідэёвым узроўні, пры больш глыбокім і верным разуменьні атабражаемых зьяў і падзей.

Мы маем ужо і некаторыя канкрэтныя вынікі гэтага творчага ажыўленьня: аповесьць Галавача «Сполах на загонах» (неапрацаванае другое выданьне), новыя творы Александровіча напрыклад, паэма «Хлебная зіма»), п'еса «Бацькаўшчына» Кузьмы Чорнага, аповесьць «Мядзьведзічы» Крапівы, новыя творы Чарота, Кобеца, Броўкі, Глебкі, Мурашкі, Гартнага, Хадыкі, Харыка, Аксэльрода, Куляшова, Хведаровіча, Мікуліча, Ліхадзіеўскага, Лынклера, Віцьбіча, Бужана і рад іншых таварышоў. Памеры артыкулу не даюць магчымасьці даць поўны малюнак творчай работы кожнага нашага пісьменьніка і пэўную ацэнку яго работы, з канкрэтным аналізам.

Мы маем пэўны перапом у творчасьці нашых народных паэтаў: Янкі Купалы і Якуба Коласа, якія адыходзяць ад былой нацыяналістычнай абмежаванасьці ў сваёй творчасьці, уключаюцца сваім мастацкім словам у будні нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Вырастаюць новыя пісьменьніцкія кадры ў філіялах саюзу, такія маладыя пісьменьнікі, як Люгоўскі, Жалязьняк, Сабаленка і інш.

Значныя творчыя дасягненьні маюць і нашы ўдарнікі - рабочыя, закліканыя ў літаратуру. Гэтыя дасягненьні ідуць па лініі творчай актывізацыі, па лініі адыходу ад цэхавай абмежаванасьці ў творах, адыходу ад прымітыўных форм, ад эмпірычных назіраньняў да больш глыбокіх мастацкіх абагульненьняў, больш глыбокіх мастацкіх аналізаў.

Найбольш творча выявіўшымі сябе зьяўляюцца такія таварышы, як Швэйдаль, Нортман, Бацюшкаў, Дзегцяр, Швэдзік і другія.

Уся творчая работа пісьменьнікаў гаворыць аб наяўнасьці глыбокага ідэйна-творчага пералому ў арганізацыі, аб наяўнасьці працэсу згуртаваньня асноўных пісьменьніцкіх сіл вакол задач, пастаўленых у гістарычных пастановах партыі, хаця на сёняшні дзень мы ня можам яшчэ гаварыць аб канчатковым завяршэньні працэсу гэтага згуртаваньня. Але гэты працэс у наяўнасьці і задача Аргкамітэту і яго першага шырокага пленуму—усімі сродкамі, усімі захадамі гэты працэс разьвіваць, падтрымліваць, узмацняць, надаючы яму патрэбныя палітычныя і арганізацыйныя формы.

І калі мы паставім пытаньне: ці справіўся-ж Аргкамітэт Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў БССР са сваімі задачамі, ці ўзначаліў ён як трэба быць жыцьцё і творчую дзейнасьць пісьменьніцкай арганізацыі, дык адказ павінен быць адзін: — Аргкамітэт, дабіўшыся больш спрыяючай творчай атмасфэры для савецкіх пісьменьнікаў, узначаліўшы ў асноўным працэс згуртаваньня пісьменьніцкіх мас вакол задач, пастаўленых партыяй перад літаратурай, працаваў усё-ж яўна нездавальняюча, з яўна маруднымі тэмпамі, дапускаючы ў сваёй рабоце і паасобныя буйныя памылкі палітычнага характару, як прытупленьне клясавай чуласьці і праяўленьне гнілога лібэралізму ў паасобных выпадках у сэнсе несваячасовага і недастатковага рэагаваньня на клясава-варожыя выступленьні на літаратурным фронце Гэтыя варожыя нацыянал-дэмакратычныя выступленьні (Сідарэнка-Пеначкін, Нікановіч, Баранавых) зьяўляліся ня чым іншым, як адлюстраваньнем актывізацыі клясавага ворага ў краіне, адлюстраваньнем супраціўленьня аджываючых капіталістычных элементаў. Я ня буду падрабязна аналізаваць кожнае выступленьне паасобку, бо аналіз і ацэнка гэтых выступленьняў дадзены на старонках савецкага друку, дадзены яны і ў пастанове аргкамітэту ад 22 студзеня гг.

Пісьменьніцкая грамадзкасьць у падаўляючым сваім складзе адмежавалася і рашуча асудзіла рэваншыцкія нацыянал-дэмакратычныя вылазкі.

Аргкамітэтам праароблена значная работа па стварэньні творчай атмасфэры ў арганізацыі (больш сарака творчых камандыровак. паасобных пісьменьнікаў, удзел некалькіх брыгад у веснавой пасеўнай кампаніі, загатоўчай кампаніі, пасылка пісьменьнікаў у розныя часьці Чырвонай арміі, цэлы рад выязных брыгад па розных прызначэньнях, шмат літаратурных вечароў, пачатак разгортваньня творчых вечароў і г. д.), па рэарганізацыі часопісаў і арганізацыі новых («Напагатове», «Заклік»), па наближэньні пісьменьніцкіх мас да савецкага тэатру, да кіно-фронту і г. д.

Але ўсё гэта яўна не задавальняе нас, у наяўнасьці буйнейшыя прарывы, асабліва па лініі шырокай масавай работы, работы з ударнікамі, заклікамымі ў літаратуру, па лініі сапраўднай творчай дапамогі кожнаму пачынаючаму пісьменьніку і пісьменьніку прафэсыяналаў, работы па творчых пытаньнях. Надзвычайна слаба яшчэ ў нас маладзёжная літаратура і яе кадры. Бадай няма дзіцячай літаратуры. Мала яшчэ зроблена ў галіне абароннай тэматыкі ў нашай літаратуры. Не дастатковы ўдзел таварышоў у стварэньні баявой сучаснай драматургіі. Слабы крытычныя кадры і надзвычай малыя па колькасьці—а гэта адно з самых вастрэйшых і балючых пытаньняў літаратурнага жыцьця.

Да гэтага часу ня зжыты яшчэ рэцыдывы групоўшчыны. Ня ліквідавана яшчэ адставаньне ўсяе літаратуры ад агульных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Весь цэлы комплекс пытаньняў і задач, якія павінен разгледзіць пашыраны пленум Аргкамітэту. Ії галоўная задача, якая стаіць перад пленумам — гэта далейшая мабілізацыя ўсіх пісьменьнікаў навакол асноўных праблем нашай сучаснасьці, яшчэ большая творчая актывізацыя пісьменьніцкіх радоў, яшчэ большае павышэньне клясавай пільнасьці і непрымірымасьці да ўсякіх варожых вылазак, з якога-б боку яны ні шлі, на нашым савецкім літаратурным фронце.

Праверaем гатоўнасьць цэнтральных установ да сяўбы | **Лісток ЦКК РСІ** | Рэйд брыгад ЦКК, газэты „Савецкая Беларусь“ і ЦСПСБ

Перaтварыць цэнтральныя установы у сапраўды баявыя штабы апэрацыйнага кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеньнем вясеньняй сяўбы

НАРКАМЗЕМ НЕ ЗАБЯСЬПЕЧЫЎ ВЫКАНАНЬНЕ

дырэктыў партыі па падрыхтоўцы да сяўбы

Амаль месяц прайшоў пасьля апублікаваньня пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб мерапрыемствах па арганізацыі веснавой сяўбы, але Наркамзем БССР і да гэтага часу ня рупіцца сапраўды перабудаваць работу свайго апарату на поўнае забесьпячэньне выкананьня ўсіх мерапрыемстваў, вызначаных гэтай пастановай.

Дадзеная ў пастанове ацэнка падрыхтоўкі да веснавой сяўбы, таксама і зямельным органам, якія «не разгарнулі баявой апэрацыйнай і канкрэтнай барацьбы за бальшавіцкую арганізацыю і правядзеньне веснавой сяўбы» застаецца і на сёнешні дзень ацэнкай работы Наркамзему.

Адсутнасьць чоткасьці ў рабоце, плянаў работы ў радзе сэктароў, адсутнасьць разьмеркаваньня функцый паміж працаўнікамі, поўная безадказнасьць працаўнікоў за даручаную ім работу, абязьлічка—вось, што пануе ў НКЗ БССР. Факты, якія прыводзяцца тут сьведчаць, што падрыхтоўка да веснавой сяўбы з боку Наркамзему знаходзіцца ў катастрафічным становішчы.

Хто-ж адказвае за каня?

Адпаведнымі органамі праведзена ўжо вялікая работа па ачыстцы апарату Наркамзему ад шкодніцкіх элемэнтаў, але трэба сказаць, што і зараз мы знаходзім у Наркамземе такіх працаўнікоў, як Ісаенка (кіраўнік сэктару кадраў), які злачынна праваліў і правальвае работу па падрыхтоўцы масавых кадраў для пасеўкампаніі. Ён ня прыняў ніякіх мер да забесьпячэньня гэтай падрыхтоўкі неабходнымі сродкамі. У сэктары нават няма пляну падрыхтоўкі кадраў да веснавой сяўбы.

Загадчык сэктару каньгадоўлі—Рагуля і кіраўнік аб'яднаньня каньгадоўлі Мілер замест ажыцьцяўленьня важнейшай пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб падрыхтоўцы рабочай жывёлы да сяўбы, замест перабудовы на грунце гэтага ўсёй работы, сваіх сэктароў, абмежаваліся толькі пасылкай цыркуляраў у раёны, а сапраўднае становішча конскага пагалоўя зусім не вядома ні сэктару, ні аб'яднаньню. Яны лічаць, што за ўкормленасьць каня адказвае Загатзерне, за коўку і збрую адказвае [illegible] сэктар, за здароўе і рамонт [illegible] установы і г. д. Фактычна выходзіць, што сэктар каньгадо[illegible]аньне зусім не нясуць ніякай адказнасьці за каня.

Аднаасобны сэктар выпаў з поля зроку НКЗ

Давядзеньне ўдакладненых плянаў веснавой сяўбы да калгасаў па лініі НКЗ праходзіць вельмі марудна. Калі зараз-жа ня будзе арганізавана чоткае апэрацыйнае кіраўніцтва гэтай справай, то ёсьць пагроза зрыву тэрмінаў сяўбы.

Як недапушчальна злачыннае зьявішча трэба адзначыць тое, што аднаасобны сэктар зусім выпаў з межаў дзейнасьці НКЗ. Ніхто нічога ня ведае ці даводзяцца пляны да аднаасобнікаў і як праводзіцца гэта работа. Ніякага ўліку няма. І наогул ўлік у органах НКЗ пастаўлены надзвычай дрэнна. НКЗ супакойваецца на тым, што зараз па лініі ЦК КП(б)Б праводзіцца праверка на мясцох гатоўнасьці да сяўбы. І, што значыць, ЦК вывучыць пытаньне давядзеньня плянаў па аднаасобным сэктары і таму НКЗ ня варта займацца гэтым.

І не выпадкова, што кожны сельсавет у справе давядзеньня плянаў асабліва па аднаасобным сэктары працуе як яму надумаецца, без належнага кіраўніцтва і кантролю. У давядзеньні плянаў сяўбы вельмі часта абмяжоўваюцца галоўным чынам тым, што патрабуюць у аднаасобніка расьпісацца на агульным лісьце, што ён абавязваецца выканаць пляны і больш нічога. І часта гэта паперка губляецца з кішэні члена сельсавету ці проста нішчыцца на «цыгаркі».

Пляны сяўбы асобных культур яшчэ ня вышлі з сьцен наркамату

Згодна пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР, абмен звычайнага насеньня на гатунковае павінен быў закончыцца да 10 лютага, а на справе маем тое, што толькі цяпер сэктар расьлінагадоўлі піша праекты для прадстаўленьня іх тав. Рачыцкаму на зацьверджаньне. Фонды гатунковага насеньня для абмену яшчэ ня вылучаны. Тэрміны сяўбы паасобных культур хоць і распрацаваны, але ляжаць на сталох наркамату і чакаюць «вынікаў увагадненьня». Дырэктыва партыі і ўраду аб радковай сяўбе хоць і распрацавана, але-ж і да гэтага часу не даведзена да калгасаў і раёнаў.

На пытаньні ўвядзеньня севазвароту, які мае выключнае значэньне ў паўышэньні ўраджаю і яго якасьці, зьвяртаецца вельмі мала ўвагі. Наркамзему не вядома аб становішчы давядзеньня плянаў севазваротаў да калгасаў і па асобных брыгад. Людзі паехалі ў раёны, нешта рабілі, але ніхто ня ведае як яны працавалі, якія папярэднія вынікі гэтай важнай работы, як раёны спаткалі пляны і самых работнікаў, а гэта вельмі важна, бо рад раёнаў пытаньне севазвароту лічаць дробязьзю (Сіроцінскі) і таму прыехаўшым людзям не дапамагаюць. Згодна з плянам севазвароты павінны быць уведзены ў 9.067 калгасах, з іх каля палавы—да пачатку веснавой сяўбы. Але факты з месц сьведчаць аб тым, што пры падобных [illegible] і гэтая работа ня будзе выканана ў вызначаны партыяй і ўрадам тэрміны. Тут побач з віной Наркамзему, які ня ведае дзе і ў якім раёне няма сьпецыялістаў, а калі ёсьць, дык колькі іх і што гэта за людзі, трэба паставіць ў віну і нашым навукова-дасьледчым установам, якія свае тэарэтычныя работы часта яшчэ ня ўвязваюць з практычнай работай і тым самым не асьвятляюць шляхоў практыкі.

Навукова-дасьледчыя ўстановы не мабілізавалі свае сілы на правядзеньне работы на мясцох па ўвядзеньні севазваротаў і наогул па ўсіх пытаньнях падрыхтоўкі да сяўбы і павышэньня ўраджаю.

Рамонт інвэнтару і вывазка ўгнаеньня ў пагражаючым становішчы

Пытаньню забясьпечаньня пасеўнай кампаніі запаснымі часткамі, завозу гаручых, вывазкі гною ў зімовы час не ўдзяляецца належная ўвага, у выніку чаго няма належнага кантролю за якаснай прыёмкай і сваячасовым накіраваньнем іх на месцы. Забясьпечаньне гаручым да пачатку разводзьдзя і па сеўнай кампаніі знаходзіцца ў катастрафічным становішчы. Замест патрэбных да пачатку кампаніі 2800 тон газы завезена на 20 лютага толькі 274 тоны 15 проц.

Вось за што адказвае насенаводчаскі сэктар НКЗему на чале з загадчыкам Рагула.

Ня лепшае становішча са зборам і захаваньнем попелу і вывазкай гною. За час саннай дарогі саўгасы і калгасы згодна дырэктыў партыі і ўраду павінны вывезьці 60 проц. гною ад агульнага пляну, а на справе процант выкананьня на 20 лютага складае каля 2. Што-ж да збору попелу, дык у НКЗ няма ніякіх зьвестак. І гэта ўсё ў той час, калі штучнага ўгнаеньня будзе завезена, замест патрэбных 130 тыс. тон, толькі 57 тыс. тон, з якіх на сёнешні дзень атрымана 34 проц.

У вывазцы гаручага і гною вінаваты ня толькі НКЗ, але і яго мясцовыя органы (райза, МТС), якія ня кіруюць гэтай справай, на месцы, упарта не даюць вестак у НКЗ. Напрыклад, дырэктар луггасаў Ветрычы—тав. Місюля, Рэчыцкі—тав. Новікаў не даюць вестак аб рамонце трактароў, аб патрэбных запасных частках, аб наяўнасьці і вывазцы гаручага.

Тэхнічная прапаганда—закінуты вучастак работы НКЗ

Да ўсіх гэтых фактаў, якія сыгналізуюць аб вялізарнейшым прарыве ў справе падрыхтоўкі Наркамзему да веснавой сяўбы і павышэньня ўраджайнасьці трэба дадаць і тое, што справа агратэхпрапаганды, якая павінна адыграць выключную ролю ў гэтым пытаньні—знаходзіцца ў поўным заняпадзе. Сэктар агратэхпропу фактычна знаходзіцца без кіраўніка на працягу году і ня мае яго да сучаснага моманту.

Аб адносінах да гэтага сэктару з боку адміністрацыйнага складу НКЗ можа сьведчыць факт ужо 9 перакідак яго ў розныя пакоі за апошні год.

Ня лепшыя адносіны таксама і да аднаго з важнейшых сэктароў у сыстэме Наркамзему—сэктару кантролю і праверкі выкананьня. У часе правядзеньня рэйду брыгада назірала факты варожых адносін і затоенай злобы ў адносінах да работнікаў сэктару кантролю. І Рагуля, і Ісаенка, і некаторыя іншыя бачаць ў асобе сэктару не неабходны орган, які павінен забясьпечыць правільнае правядзеньне ў жыцьцё важнейшых дырэктыў партыі і ўраду, у чым яму павінна дапамагчы ўся грамадзкасьць, а, наадварот, яго сустракаюць як свайго ўнутранога ворага. Ёсьць факты недаацэнкі сэктару кантролю з боку кіраўніцтва НКЗ. Як прыклад: пры агульным скарачэньні штатаў апарату НКЗ на 30-40 проц. сэктар кантролю скарочаны з 10 да 2 работнікаў. Гэты сэктар так сама перакідаўся з пакою ў пакой тры разы за зусім кароткі час.

* *

Гэтыя рад фактаў ёсьць вынік папяровага кіраўніцтва, якое пануе ў НКЗ, ёсьць вынік фэтышызацыі моцы паперкі і абежніка, лік якіх за апошні час набыў вялізарнейшыя размеры (звыш тысячы абежнікаў і пастаноў). Характэрна, што толькі ў апошнія дні ўводзіцца арганізацыйна - інструктарскі аддзел, а да гэтага часу фактычнай праверкі дзейнасьці месц ня было і ня было ніякай увязкі работы ня толькі паміж сэктарамі, але і ўнутры самых сэктароў.

Гэтыя факты патрабуюць рашучага пералому і ўнясеньня апэрацыйнай чоткасьці ва ўсю работу НКЗ, унясеньня чоткасьці і апэрацыйнасьці ў работу кожнага працаўніка, каб сапраўды забясьпечыць правядзеньне ў жыцьцё дырэктывы ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб мерапрыемствах па арганізацыі веснавой сяўбы.

Брыгада ЦКК-РСІ, газэты «Савецкая Беларусь», ЦСПСБ. Беруна, Паспробка, Глозман, Шулько, Маргус.

„Партыя ўжо ня можа зараз абмяжоўвацца асобнымі актамі ўмяшацельства ў працэс сельска-гаспадарчага разьвіцьця. Яна павінна зараз узяць у свае рукі кіраўніцтва калгасамі, прыняць на сябе адказнасьць за работу і дапамагчы калгасьнікам весьці сваю гаспадарку наперад на аснове даных навукі і тэхнікі“ (І. СТАЛІН).

Процант выкананьня вырабу запасных частак прымушае біць трывогу

У зводцы Наркамцяжпрому аб становішчы рамонту трактароў на 19 лютага фігуруе лічба 12,2. Калі прыняць пад увагу, што 15 сакавіка—апошні тэрмін сканчэньня рамонту трактароў, згодна дырэктыў партыі і ўраду, дык гэтая лічба сьведчыць аб прарыве.

У вырабе запасных частак да трактароў мы наглядаем вельмі цікавы малюнак. З аднаго боку, некаторыя запасныя часткі зьзгатоўлены на 100 і 150 проц., а да вырабу другіх частак яшчэ ня прыступлена. Вось факты.

Балванак і колцаў ХТЗ і ФП выраблена 100 проц., поршняў зроблена 1095 замест 700, але на гэтых двух запасных частках канчаюцца трохзначныя лічбы выкананьня пляну. Далей ідуць такія: камплектных поршняў зроблена на 21,1 проц., абточка поршневых колцаў—23,3 проц., дыскі да муфт счапленьня—12 проц., поршнявыя пальцы—7,5 проц. і г. д.

Яшчэ не пачалі выраблядь шатунных балтоў, утулак бронзавых для галовак шатуна, утулак цапф, утулак шатуна.

У чым-жа нарэшце прычыны невыстарчальнага рамонту і вырабу запасных частак. Для таго, каб адказаць на гэтае пытаньне, трэба зьвярнуцца да забясьпечаньня прадпрыемстваў Наркамцяжпрому сыравінай.

Наркамцяжпром і ў прыватнасьці яго заводы, якія зараз заняты рамонтам трактароў і вырабам запасных частак, вельмі часта скардзяцца на тое, што адсутнасьць каляровых мэталяў, хроманікелевай сталі і другіх матэр'ялаў зрывае ім выкананьне праграм. Больш менш падрабязны аналіз забясьпечаньня заводаў сыравінай абвяргае гэтую «аб'ектыўную» ўмову.

З патрэбных 2600 клг. каляровых мэталяў на сёнешні дзень ёсьць 2000 Гомсельмашу на гэтых днях адгружана з Кіеву 1406 кілёграм чырвонай медзі, якая ідзе на выраб поршняў. Як Гомсельмаш, так і іншыя заводы на сёнешні дзень не адчуваюць вялікага недахопу ў каляровых мэталях.

— Вельмі дрэнна з хроманікелевай стальлю—сакрушальна заяўляюць кіраўнікі з Наркамцяжпрому.

Ці гэта так? Якое-ж сапраўднае становішча з забесьпячэньнем заводаў хроманікелевай стальлю. Раскажам, як завод Варашылава знайшоў выхад з гэтага становішча.

На заводзе Варашылава быў асобны гатунак жалеза, які пасьля хімічнай апрацоўкі можа з посьпехам замяніць хроманікелевую сталь. У той час, як завод Варашылава даўно карыстаецца гэтай стальлю, другія заводы закідвалі Наркамцяжпром заяўкамі аб адсутнасьці хроманікелевай сталі. Замест таго, каб вопыт варашылаўцаў перанесьці на ўсе заводы Наркамцяжпром пасылаў людзей ва ўсе канцы СССР у пошуках гэтага гатунку сталі. Толькі зараз, на Гомсельмаш накіравана больш 4-х тон гэтага жалеза.

Калі да гэтага дадаць, што Стальзбыт на працягу першай дэкады сакавіка абяцае завезьці ў БССР 4 тоны хроманікелевай сталі, дык стане ясна, што ківаць на адсутнасьць сыравіны Наркамцяжпрому не даводзіцца.

Замест таго, каб заняцца сапраўдным адшукваньнем недастаючых матэр'ялаў, Наркамцяжпром, з аднаго боку, і Белсельгасснабзбыт,- з другога—і да гэтага часу спрачаюцца, каму з іх належыць гонар разьмеркаваць паміж заводамі і МТС наяўны бабіт. Белсельгассназбыт прытрымліваецца такога погляду, што бабіт трэба аддаць МТС, а МТС па патрэбнасьці будзе разьмяркоўваць бабіт заводам. Наркамцяжпром лічыць, што МТС бабіт не патрэбен і што яго трэба перадаць на заводы.

У выніку такіх спрэчак заводы адчуваюць недахоп у бабіце і зразумела, што спрэчка паміж ведамстваў дрэнна адаб'ецца на вырабе запасных частак.

Які-ж вывад можна зрабіць з прыведзеных фактаў.

Першае. Наркамцяжпром ня здолеў апэрацыйна кіраваць вырабам запасных частак, ня здолеў паставіць работу на заводах так, каб не атрымалася перагрузка гатовымі часткамі аднэй назвы (балванкі) і амаль адсутнасьць другіх частак.

Другое. Ні ў якім разе нельга ўскладаць віну на адсутнасьць сыравіны і гэтым тлумачыць сваю бязьдзейнасьць. Практыка давала, што заводы ня выконваюць сваіх праграм па якіх іначае прычынах, але толькі не з-за адсутнасьці сталі або медзі.

Некалькі слоў аб якасьці рамонту і выпушчаных запасных частак. Пяршынство ў галіне вырабу браку ўзяў Гомсельмаш. Так, з-за дрэннай якасьці чугуннага адліву, поршні, якія выраблае Гомсельмаш, амаль на 50 пр. сьпісаны ў брак. Калі на заводзе «Пралетары» прыступілі да абточкі поршняў, дык з 350 штук 166 пашлі ў брак.

А на «Чырвоным Адраджэнцы» якасьць рамонту пастаўлена так, што былі выпадкі, калі адрамантаваны трактар, ня ўсьпеўшы выйсьці за вароты, псаваўся і зварочваўся на паўторны рамонт.

За якасьцю выпусканых трактароў і запасных частак заводы ня сочаць. У пагоні за колькасьцю заводы выпускаюць дрэнныя часткі. Асноўная прычына дрэннай якасьці—непадрыхтаванасьць заводаў да выкананьня ўзятых заказаў.

Выключэньнем зьяўляецца завод імя Варашылава. Тут загадзя была разгорнута вялікая падрыхтоўчая работа да пасеўнай кампаніі. Заводзкай лябараторыяй было прароблена шмат вопытаў і ў выніку завод даб'ўся таго, што напрыклад, поршнявыя колцы вырабляюцца тут найвышэйшай якасьці. Паводле лябараторных даных якасьць поршнявых колцаў заводу Варашылава лепшая, як замежных. Калі поршнявыя колцы, якія выпускаюцца заводамі Сталінграду, вытрымліваюць на сьціск 5,5 кілёграм, дык колцы заводу Варашылава вытрымліваюць 6 кілёграм.

Толькі гэтымі днямі ў Наркамцяжпроме дагадаліся паслаць на адстаючыя заводы інжынэра заводу Варашылава тав. Фіша. Да гэтага часу Наркамцяжпром абмяжоўваўся рэгістрацыяй паступаючых зводак, а на якасьць не зварочваў належнай увагі.

Нельга не сказаць аб якасьці апэрацыйнага кіраўніцтва ў апараце ўпаўнаважанага Наркамцяжпрому. Адказным за рамонт трактараў і выраб запасных частак зьяўляецца тав. АМОСАЎ. Гэта здольны рабочы-вылучэнец, які дзень і ноч заняты работай па рамонце трактараў і вырабе запасных частак. Але якім-бы талёнавітым Амосаў ня быў, ён усё-ж ня можа справіцца з гэтай работай. Амосаў акрамя гэтай нагрузкі кіруе яшчэ трыма сэктарамі. Увесь штат, які заняты пытаньнямі падрыхтоўкі да веснавой сяўбы, складаецца з тав. Амосова, Амосова і Амосова...

Гэты факт характарызуе ў некаторай ступені якасьць апэрацыйнага кіраўніцтва, якое патрэбна зараз пры падрыхтоўцы сталёвых коняў да веснавой сяўбы.

15-га сакавіка—апошні тэрмін сканчэньня рамонту трактароў і вырабу запасных частак. Пры існуючых тэмпах работы па лініі заводаў Наркамцяжпрому цяжка спадзявацца на тое, што плян будзе выкананы. Калі зараз-жа на заводах Наркамцяжпрому гэтая работа ня будзе пастаўлена сапраўды па ўдарнаму, калі Наркамцяжпром будзе займацца ня толькі складаньнем зводак, але і апэрацыйным, штодзённым, практычным кіраўніцтвам, дык заданьні ЦК і СНК БССР бязумоўна будуць выкананы.

Брыгада ЦКК, ЦСПСБ, газ. «Сав. Бел.» Бр., Воцкі і Фельдман.

Асвоіць выпуск камплектных поршняў

Плян рамонту трактароў і вырабу запасных частак быў даведзены да прамысловасьці з вялікімі спазьненьнем. Ні НКЗем, ні ўпаўнаважаны НК Саўгасаў ня мелі канкрэтных даных аб колькасьці трактароў, якія патрэбна адрамантаваць, а таксама ня ведалі аб неабходнай колькасьці запасных частак. Адсутнічалі ўсякія тэхнічныя абгрунтаваньні, дэфэктныя ведамасьці, спэцыфікацыі. Рамонт трактароў ня быў разьбіты на капітальны і бягучы.

Спачатку НКЗемам ня было ўдзелена дастатковай увагі рамонту трактароў і вырабу запасных частак. Напрыклад, пастановай калегіі НКЗему былі замацаваны заводы да рамонту трактароў і вырабу запчастак бяз ведама Наркамцяжпрому і Белмэталятрэсту, што ў свой час прывяло да путаніны.

Паводле дасланага пляну НКЗемам завод Гомсельмаш на 1-І—33 г. павінен быў адрамантаваць 45 штук трактароў, а на 5-І-33 г. НКЗем нават ніводнага трактару і ніводнага дэфэктнага акту заводу не даставіў.

Згодна пляну завод **«Рухавік Рэвалюцыі»** павінен адрамантаваць 50 шт. трактараў, **Завод Гомсельмаш** 50 шт. трактароў, 10.700 шатунных балтоў, 200 дыскаў для муфт. **Завод імя Варашылава** праверыць 25 каленчатых валоў, 500 камплектаў поршняў і чорнае ліцьцё для калец на 10.000 штук. **Завод «Камунар»** апрацаваць 25 каленчатых валоў, 5.000 шт. колцаў (з балванак. заводу імя Варашылава).

Завод «Чырвоны Адраджэнец» апрацаваць 5000 шт. калец (з балванак заводу імя Варашылава). **Завод «Пралетары»** 25 шт. каленчатых валоў і 1800 утулак бронзавых.

Звыш гэтага заводы заключаюць дагаворы непасрэдна з МТС і саўгасамі.

Згодна з гэтым плянам, заводы заключылі адпаведныя ўмовы. Уся праца па вырабе запчастак і рамонце трактароў павінна быць скончана не пазьней 15 сакавіка г. г.

Але ж, ня гледзячы на зусім яскравую дырэктыву партыі і ўраду, мела месца глыбокае парушэньне ўстаноўленых тэрмінаў ў падрыхтоўцы да веснавой сяўбы.

Заводы Гомсельмаш—і «Пралетары» пры заключэньні дагавораў расьцягнулі тэрміны на 3—4 месяцы.

З боку ўпаўнаважанага Наркамцяжпрому былі прыняты сваячасовыя захады на акуляцыі гэтых дагавораў і ўстанаўленьні жорсткіх тэрмінаў згодна дырэктыў партыі і ўраду. Выканана пастанова СНК БССР аб перадачы Аршанскага заводу «Чырвоны Барацьбіт» рэспубліканскай прамысловасьці, а мэтай спэцыялізацыі яго па вырабе запасных частак. Завод перайшоў непасрэдна пад загадваньне рэспубліканскай прамысловасьці. Распрацаваны плян рэканструкцыі заводу, перакінута новае абсталяваньне.

Белмэтальтрэстам спэцыяльна камандыраваны інжынэр на Сталінградзкі трактарны завод для большага асваеньня вытворчасьці вырабу запасных частак і рамонту трактароў.

Пастанова ЦК УсеКП(б) і ЦКК КП(б)Б аб узмацненьні МТМ патрэбным спэцыяльным абсталяваньнем праводзіцца ў жыцьцё. Белмэталятрэстам намечана перадаць з заводу «Варашылаў» 7 новых такарных станкоў, з якіх 4 ужо перададзены МТМ.

У выкананьні дырэктыў партыі і ўраду па заводах мэталяпрамысловасьці на 5 лютага мы маем значны пералом у забясьпечаньні сельскай гаспадаркі да пасеўнай кампаніі запчасткамі і рамонтам трактароў.

Заводы пераключыліся на выкананьне заданьняў па вырабе запчастак і рамонце трактароў.

На 10 лютага плян выкананы наступным чынам: **Завод Гомсельмаш.** Адліта 294 шт. поршняў, 4 шт. гільз і 9 каробак. Прыняты захады падвоіць выпуск ліцьця. Праверана 16 валоў. Адрамантавана 7 трактароў.

Завод «Пралетары». Апрацаваў 60 шт. поршняў, 4 каробкі, 2 гільзы. Плян працы даведзены да рабочага месца. Рабочыя даюць сустрэчны.

Завод «Чырвоны барацьбіт». Адрамантаваны дэталі на 26 трактароў. Затрымка ў зборцы з-за адсутнасьці пакупных запасных частак, гэтым загамаджаецца памяшканьне і няма магчымасьці прыступіць да рамонту іншых трактароў.

Завод «Камунар». Атрымана ад заводу «Варашылаў» 200 барабанаў для колцаў. Апрацавана 150 поршневых колцаў. Закончваецца прыстасаваньне для павялічэньня выпуску да 200 шт колцаў у дзень.

Завод **«Рухавік рэвалюцыі».** Паступіла для рамонту 30 трактароў. Для гэтага рамонту выдзелена скразная брыгада ў колькасьці 30 чалавек.

Завод імя Варашылава. Перадана заводу «Камунар» 200 барабанаў на 2000 колцаў. Перадана «Адраджэнцу» 129 барабанаў на 1290 колцаў, разам 3290 колцаў. Адліта 160 поршняў і 30 шт. знаходзіцца ў адліўцы. У апрацоўцы 53 шт. поршні. Пальцаў перадана ў цэмэнтоўку 42 шт. Поршняў гатовых цалкам 2 шт. Адгружана МТМ тры такарных варштаты.

Справа вырабу запасных частак рамонту трактароў для заводаў мэталяпрамысловасьці БССР зьяўляецца зусім новай, якая патрабуе значнага вопыту і асваеньня і максымальнай мабілізацыі ўвагі да выкананьня важнейшых гаспадарча-палітычных задач. Трэба як мага хутчэй дабіцца асваеньня як колькасьці, так і якасьці.

Першыя крокі работ асваеньня па заводзе «Варашылаў» паказалі досыць здавальняючыя вынікі, але завод яшчэ не дабіўся поўнага асваеньня якасьці камплектных поршняў.

Павінна быць разгорнута работа па аддзелах тэхнічнага кантролю, каб не запусьціць выпуску ня зусім дабраякасных частак.

Шляхам разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, прыцягненьня ўсіх рабочых і ІТР заводаў дабіцца 100-процантнага выкананьня заданьняў.

Уся работа павінна праходзіць не кампанейскім чынам, а павінна быць штодзённай апэрацыйнай работай. Пляны работы па ўсіх заводах павінны быць даведзены да кожнага рабочага.

Заводакіраўніцтвы на гэтую работу павінны вызначыць рабочых лепшай кваліфікацыі. Прэміяваць лепшых ударнікаў за больш высокія паказьнікі якасьці і колькасьці запчастак і рамонт трактароў.

Трэба адзначыць, што па сыстэме НКЗему і НКСаўгасаў яшчэ няма патрэбнага пералому ў галіне сваячасовай праверкі выкананьня: ня ўсе трактары, падлягаючыя рамонту дастаўлены на заводы, матэр'ялы (хроманікелевая сталь, бронза, чырвоная медзь) заводам яшчэ не адгружаны, таксама не паданы чарцяжы на адказныя дэталі.

НКЗем і НКСаўгасаў павінны зараз-жа прыняць самыя рашучыя меры, каб зьнішчыць гэтыя недахопы.

Сваячасовае 100-процантнае сканчэньне рамонту трактароў да пачатку веснавой сяўбы—баявая задача ўсіх партыйных і савецкіх арганізацый.

Айзэнбэрг О. А.

Зелянкоўскі займаецца ачкаўціраньнем

Баявая падрыхтоўка да веснавой сяўбы зьяўляецца асноўнай задачай МТС. Ужо зараз неабходна ва ўсю шырыню разгарнуць гэту падрыхтоўку такім чынам, каб веснавую сяўбу правесьці ў максымальна кароткі тэрмін.

Кіраўніцтва Шклоўскай МТС не ўсьведоміла ўсёй важнасьці сваячасовай падрыхтоўкі да сяўбы і таму гэтую работу вядзе не сьпяшаючыся.

29 трактароў, выбыўшых са строю ў выніку нядбайных адносін да іх патрабуюць рамонту. Як ідзе гэты рамонт? Надзвычайна марудна. З 29 трактароў адрамантавана толькі 4 трактары. Дырэктар МТС Зелянкоўскі займаецца ачкаўціраньнем. Ён заявіў, што адрамантавана 13 трактароў, у той час, як адрамантавана толькі 4.

На дробным рамонце ў майстэрні МТС знаходзіцца 7 трактароў. Рамонт гэтых трактароў не арганізаваны, сілы не расстаўлены належным чынам. Рамонт трактароў праходзіць дрэнна. На рамонце занята толькі 8 трактарыстаў, але і яны зараз панікулі работу. З боку кіраўніцтва МТС ня выканана адна з умоў тав. Сталіна аб палепшаньні быту рабочых.

Трактарысты былі прымацаваны да сталоўкі Лесазаводу, «Барацьба», але кіраўніцтва МТС не дагаварылася са сталоўкай аб харчаваньні трактарыстаў і яна не харчуе іх.

Падрыхтоўка кадраў трактарыстаў пастаўлена дрэнна. МТС арганізавала курсы ў парадку самацёку, набраўшы на курсы дзяцей фізычна ня здольных працаваць на трактары.

Калгасы абслугоўваемыя МТС яшчэ ня скончылі засыпку насенных і страхавых фондаў. План па засыпцы выканан па лёну на 40 проц., ячменю—78 проц., аўсу 62,8 проц., бабовых—37,5 проц. Нічога абсалютна ня робіцца па фарсаваньні тэмпаў засыпкі.

Насеньне, якое засыпана, не ачышчана, нават ніякіх зьвестак у МТС аб засыпцы зусім няма.

Дырэктар МТС Зелянкоўскі зусім ня ведае аб становішчы з падрыхтоўкай да сяўбы па МТС. У майстэрні ён ніколі ня бывае. Як ідзе там работа ня ведае.

Ул. Стромскі

Устанавіць жорсткую адказнасьць за рамонт трактароў і с-г. машын

Рамонт трактараў і сельска - гаспадарчых машын зьяўляецца зараз важнейшай гаспадарча-палітычнай задачай веснавой пасеўнай кампаніі. Не падрыхтаванасьць да вясны хоць-бы аднаго трактара абазначае, што дзесяткі гектараў могуць застацца незасеянымі. Несваячасовы і недобраякасны выпуск трактараў з рамонту можа пацягнуць за сабою зрыў тэрмінаў сяўбы.

Вырашэньне гэтай асноўнай задачы не знайшло аднак належнага праламленьня ў штодзённай рабоце ў бульбяным, зярнёвым і льняным трактарацэнтрах. Кампанія рамонту трактараў і сельска-гаспадарчых машын, якая павінна быць скончана не пазьней 15 сакавіка, яшчэ не разгорнута. Бульбатрактарацэнтр на сёнешні дзень ня склаў нават пляну рамонту і ня мае сувязі з калгасамі. Рамонт трактараў выканан на 20 лютага на 31,6 проц. Трэ' было адрамантаваць да гэтага часу 350 трактараў з агульнай колькасьці падлягаючых рамонту 587, адрамантавана-ж толькі 135 трактараў.

Такі малюнак мы бачым і ў зярнёвым трактарацэнтры. Плян рамонту да 20 лютага выкананы на 36,2 проц., пры агульным ліку 342 трактароў, падлягаючых капітальнаму рамонту - адрамантавана толькі 24, а паводле пляну да 20 лютага трэ' было адрамантаваць 156 трактараў. Рамонт плугоў і прычэпнага інвэнтара выкананы на 14,5 проц., адрамантавана 197 плугоў, з ліку 443 падлягаючых рамонту.

Апараты трактарацэнтраў падмянілі жывое апэрацыйнае кіраўніцтва шматлікімі цыркулярамі.

Ня лепшая, а яшчэ горшая справа з рамонтам трактароў па лёнатрактарацэнтры, які адрамантаваў 197 трактароў, пры агульным ліку 623 падлягаючых капітальнаму рамонту,—выканаўшы плян ў адносінах да квартальнага заданьня толькі на 28,3 проц. Рамонт плугоў выкананы на 58,9 проц., адрамантавана 445 плугоў пры пляне 756.

Асобныя МТМ і МТС ня ўлічылі ўсёй важнасьці рамонтнай кампаніі. Ня ўлічылі важнасьці якасьці рамонту.

Галоўнае ў рамонце,—гэта барацьба за якасьць. Аднак, Аршанская МТМ не зразумела гэтага і працягвае выпускаць дрэнныя валы. Клімавіцкая МТС выраблае замест сталёвых гаек—жалезныя. Паасобныя МТС заняліся вочкаўціраньнем прысылаючы павялічаныя весткі ў трактарацэнтр.

У чым-жа выражаецца дапамога і кіраўніцтва з боку трактарацэнтраў? Паставіўшы гэткае пытаньне,—аднаму з кіраўнікоў трактарацэнтру пачуеш адказ. «Кіраўніцтва ёсьць. У кожнай МТМ і МТС сядзіць адказны работнік трактарацэнтру». І усе, як быццам добра, але на справе зусім ня так. Кіраўнікі сядзяць на мясцох і ня бачаць тых недахопаў і прарываў, якія ёсьць па МТС і МТМ. Напрыклад, у Бягомельскай МТС знаходзіцца **Сарокін,** у Аршанскай МТМ—**Цыпкаваты,** у Клімавіцкай МТС—**Навуменка,** у Рагачэве—тэх інпэктар **Луст,** аднак гэтыя МТС і МТМ да гэтага часу ня вылезьлі з прарыву і праводзяць работу накіраваную на зрыў рамонту трактараў. Да Дзяржынскай МТС прымацаваны тав. Бакульманаў, які ўвесь час знаходзіцца ў Менску.

Трактарацэнтры акрамя таго, што разбілі сваіх работнікаў і прымацавалі да паасобнай МТС і МТМ нічога больш не зрабілі. Не заслухоўваюцца нават інфармацыі прымацаваных аб становішчы рамонту, канкрэтнай іх дапамозе і кіраўніцтве. Дырэктывы, спушчаныя ў МТС і МТМ, не правяраюцца.

Пытаньне падрыхтоўкі кадраў амаль ўсімі трактарацэнтрамі сарвана. У бульбатрактарацэнтры кіраўнік сэктару кадраў Жданаў ня ведае нават каго рыхтаваць у гэтым годзе.

Такое зьявішча назіраецца і па лёнатрактарацэнтры, які старшых мэханікаў трактарыстаў рыхтуе усяго 2 чалавекі. Мэханікаў па сельска-гаспадарчых машынах рыхтуе 4. Паляводаў рыхтуе 181 чал. замест 1000. Патрэбна падрыхтаваць трактарыстаў рулявых 1770 чалавек, аднак да гэтага часу курсы не ўкамплектаваны.

Пытаньню падрыхтоўкі кадраў, па ўсіх трактарацэнтрах не надана належнай ўвагі. І гэта адказная задача апушчана на хвалі самацёку і яўна зрываецца. Той факт, што да гэтага часу ніводзін трактарацэнтр не ўкамплектаваў ніводных курсаў па падрыхтоўцы кадраў, ня выканаў план па рамонце трактароў, нельга тлумачыць нічым іншым, як адсутнасьцю сапраўднага баявога апэрацыйнага кіраўніцтва гэтай работай.

Трактарацэнтрам трэба неадкладна разгарнуць сапраўдныя тэмпы узяўшы пад свой непасрэдны кантроль работу ўсіх МТС і МТМ, забясьпечыўшы сваячасовы і добраякасны рамонт трактароў і сельска-гаспадарчых машын, памятаючы, што сваячасовы і добраякасны рамонт трактараў і інвэнтара павінен забясьпечыць пасьпяховае і сваячасовае сканчэньне сяўбы. Вінаватыя ў зрыве рамонту, у дрэннай якасьці рамонту павінны быць прыцягнуты да самай жорсткай адказнасьці.

Брыгада: ЦКК, газэты «Савецкая Беларусь», ЦСПСБ: Гарошка, Эфраімскі, Гатаўскі.

Арганізаваць сваячасова і бесьперабойна крэдытаваньне калгасаў і саўгасаў

Вынікі работы Белканторы сацзембанку па крэдытаваньні калгасаў, за палову першага кварталу, далі вельмі нездавальняючую лічбу: з адпушчаных на гэту справу 1.743.000 руб., калгасамі атрымана толькі 270.000 руб., ці 15,5 проц. квартальнага пляну. Калгасы ня хочуць браць крэдытаў? Не, гэтага сказаць нельга. Праўда, бываюць і выключэньні, калі сапраўды, які небудзь калгас з боязнасьці «улезьці ў доўг» адмаўляецца ад магчымасьці атрымаць крэдыт.

Аднак, гэта паасобныя выпадкі. Асноўная-ж прычына нескарыстаньня адпушчаных крэдытаў заключаецца ня ў гэтым. Згодна ўстаноўленага сацзембанкам парадку крэдытаваньня калгасаў (на 1 квартал 1933 года) «роўналежна з плянам крэдытаваньня 1 квартала ў раёны павінны быць абвешчаны плянавыя вытворчыя заданьні па крэдытуемых мерапрыемствах, з тым, каб раённыя аддзяленьні банка ажыцьцяўлялі назіраньні і кантроль за выкананьнем пляну капітальных укладаньняў у калгас».

Інакш гаворачы, для таго, каб сапраўды ажыцьцяўляць кантроль рублем за расходваньнем адпушчаных крэдытаў, банк павінен канкрэтна ведаць куды і на што ён дае крэдыт, як гэты крэдыт будзе рэалізавацца. Без гэтага банк ня мае права даць ні аднэй капейкі ў крэдыт.

Усе гэтыя матэр'ялы банку павінна даць кіруючая арганізацыя калгаснай сыстэмы, выходзячы з устаноўленых для іх лімітаў крэдытаваньня і заявак сваіх нізавых зьвеньняў.

На практыцы атрымоўваецца інакш. Атрымаўшы ўстаноўленыя ліміты крэдытаваньня калгасаў, Белкантора сацзембанка 3 студзеня абвясьціла раёнам плян крэдытаваньня, указаўшы адначасна і парадак выдачы крэдытаў. Аднак, вытворчыя заданьні калгасам аказаліся ня спушчанымі. Такім чынам атрымалася, што раённыя аддзяленьні, банка, атрымаўшы прошлы і плян крэдытаваньня ўсё-ж не змаглі пачаць рэалізацыю гэтага пляну, таму што ня мелі вытворчых плянаў.

Патрабаваньні Белканторы сацзембанку ад аб'яднаньняў калгасна-таварных фэрм НКЗ аб спуску раёнам вытворчых плянаў заставаліся ў паветры. Вытворчыя пляны—заданьні складаліся марудна, у выніку чаго, банк аказаўся прымушаным 20 студзеня закрыць крэдыты малочна - таварнаму, цялятагадоўча - таварнаму, сьвінагадоўча - таварнаму, конягадоўча - таварнаму аб'яднаньням, калгасным фэрмам; — і такавы быў адкрыт толькі 20 лютага, а птушкагадоўчаму аб'яднаньню і інкубатарнай станцыі—толькі 23 лютага. Такім чынам калгасы, якія ўваходзілі ў дзяныя аб'яднаньні, па віне апошніх, цэлы месяц былі пазбаўлены магчымасьці атрымаць неабходныя крэдыты.

Да якой ступені даходзіць бюрократызм чыноўнікаў паасобных калгасных аб'яднаньняў, бачна з работы па крэдытаваньні калгасаў. Напрыклад, пасьля таго як Белкантора сацзембанка спусьціла ў раёны плян крэдытаваньня калгасаў на 1 квартал, з жывёлагадоўчага аб'яднаньня калгасна-таварных фэрм і сэктару конягадоўлі пры Наркамземе ў раёны паляцелі «дырэктывы». У гэтых «дырэктывах» сурова загадваецца скарыстоўваць адпушчаныя крэдыты выключна на плянавае будаўніцтва. А пляны па гэтым будаўніцтве засталіся ляжаць ня скончанымі ў папках тых-жа бюракратаў (а можа і шкоднікаў). Інкубатарная станцыя, якая для атрыманьня крэдыта на новае будаўніцтва павінна была прадставіць тытульныя сьпіскі аб'ектаў будаўніцтва, зрабіла гэта толькі 23 лютага. Між тым, згодна пастановы ЭКАСА БССР ад 10 студзеня 1933 г. абавязала НКЗ, упаўнаважанага НК Саўгасаў, дырэктара птушкатрэсту і дырэктароў інкубатарных станцый, не пазьней 20 лютага, закончыць будаўніцтва інкубатарных станцый, абсталяваньне, бруззеры, інкубатары і птушнікі, а да 10 сакавіка закончыць работу па праверцы годнасьці ўсяго абсталяваньня інкубатарных станцый з тым, каб сваячасова ўтварыць закладку яек і пазбавіцца вялікага адыходу цыплят, які меў месца ў мінулым годзе. Ці трэба гаварыць аб тым, што гэта дырэктыва ўраду будзе ня выконвацца пры такім становішчы.

Другой прычынай невыкананьня пляну крэдытаваньня калгасаў зьявілася недапушчальная зацяжка зацьверджаньня заявак калгасаў райземаддзеламі. З боку НКЗ, райза бадай не атрымалі неабходнага націску і вялі гэтую работу з прахладцем. Зацьверджаныя заяўкі на крэдыты, паступаюць з боку райза недапушчальна марудна.

Сацзембанкам зараз устаноўлены парадак крэдытаваньня калгасаў на другі і пасьледуючыя кварталы. Згодна ўстаноўленага парадку, за месяц да пачатку квартала, кантора сацзембанку, разам з земорганамі, на аснове гадавых лімітаў і выкананьня квартальнага пляну крэдытаваньня, а таксама заявак раёну, складаюць заяўку на неабходныя крэдыты калгасаў на наступны квартал.

Да пачатку складаньня заявак засталося некалькі дзён. Аднак, гэта работа амаль не пачата. Гэта ставіць пагрозу паўтарэньня «гісторыі» 1 квартала. Гэтага дапусьціць нельга. Пытаньнем крэдытаваньня калгасаў у II квартале павінна заняцца адпаведныя органы. Канкрэтных зрыўшчыкаў гэтай работы неабходна прыцягнуць да суровай адказнасьці.

Брыгада: **Копшык, Маслоўскі, Кніжнікаў, Пакроўскі.**

За ГРАНІЦАЙ

Японская дэлегацыя пакінула паседжаньне пленуму Ліга нацый

Выступленьне кітайскага дэлегата

ЖЭНЕВА. 24-ІІ. (ТАСС). Пасяджэньне надзвычайнага пленуму Лігі нацый, прысьвечанае абгаварэньню праэкта дакладу па японска-кітайскім канфлікце, адкрылася заявай ГІМАНСА. Ад імя «Камісіі 19-ці» ён указаў, што ўсебакова вывучыўшы японскія заўвагі, камісія не знайшла неабходным унесьці якія небудзь зьмены ў праэкт. Па словах Гіманса, паколькі праект быў аднагалосна прыняты і выказвае аднадушную думку членаў камісіі, апошнія рашылі ня браць слова ў спрэчках па дакладу.

Затым выступіў кітайскі дэлегат ІЕН. «Я выступаю, заявіў ён, са зьмешаным пачуцьцём аблягчэньня і ўдзячнасьці, — мы прышлі зараз да абмеркаваньня пытаньня аб парушэньні пакту, зробленым відным членам Лігі нацый».

Аналізуючы асобныя разьдзелы дакладу, Іен асабліва падкрэсьліваў тэзісы аб тым, што Манчжурыя зьяўляецца непадзельнай часткай Кітаю. Іен з задаволеньнем адзначае канстатаваньне таго факту, што японскія дзеяньні ня былі самаабаронай. Ён задаволен таксама пядвусэнсовым вывадам адносна, так званай, Манчжурскай дзяржавы, пацьвярджаючы погляды Кітайскага ўраду па гэтым пытаньні.

Іен выказвае задаволеньне з поваду таго, што па словах дакладу, прадметам перагавораў павінна быць арганізацыя эвакуацыі японскіх войск з акрэсьленьнем яе мэтадаў, этапаў і тэрмінаў. Іен задаволен таксама «цьвёрдай пазыцыяй» Лігі ў адносінах непрызнаньня Маньчжоў—го». Іен спыняецца на прапанове членам Лігі нацый, якая маецца ў дакладзе, узгадняць свае дзеяньні ў адносінах непрызнаньня Манчжурскай дзяржавы ні дэ-юрэ, ні дэ-факто, а таксама на прапанове ўзгадняць адпаведныя дзеяньні з ня членамі Лігі.

«Кітайскі ўрад, — заяўляе Іен,—шчыра вітае ідэю супрацоўніцтва Злучаных Штатаў і СССР з Лігай Нацый у яе намаганьнях урэгуляваць канфлікт. Эвентуальны ўдзел у справе гэтых двух вялікіх краін Ціха-акіянскага басэйну ў вышэйшай ступені пажаданы з пункту гледжаньня захаваньня міру на Далёкім Усходзе».

Прамова Мацуока

ЖЭНЭВА. 24-ІІ. На надзвычайным пленуме Лігі нацый, пасьля кітайскага дэлегата ІЕНА, з вялікай прамовай выступіў японскі дэлегат МАЦУОКА.

«Асноўная рыса, праходзячая праз увесь праекта дакладу,—заявіў Мацуока,—гэта «яўная няздольнасьць камісіі 19-ці зразумець сучасную сытуацыю на Далёкім Уходзе і цяжкасьці становішча Японіі». Далей Мацуока заявіў, што за час перавароту ў Кітаі, многія тэрыторыі, якія пры манчжурскай дынастыі лічыліся належачымі да Кітаю, былі страчаны кітайскай рэспублікай і не знаходзяцца пад кантролем Кітаю. Падкрэсьліваючы, што Кітай насяляюць розныя плямёны, што ў ім «шмат розных урадаў», Мацуока бачыць у гэтым прычыну няздольнасьці Кітаю вызваліцца ад замежных ваенных сіл. Пры гэтым Мацуока напамінае, што ПЯЦЬ ГОД ТАМУ НАЗАД АНГЛІЧАНЕ І АМЭРЫКАНЦЫ ТАКСАМА ПУСЬЦІЛІ Ў ХОД ЗБРОЮ Ў НАНКІНЕ для «ўратаваньня сваіх грамадзян».

Мацуока заявіў, што будучы суседам Кітаю, які «знаходзіцца ў хаосе», Японія прабавала весьці палітыку дружбы і супрацоўніцтва, але гэтай палітыцы перашкаджаў Кітай. Адзначыўшы значэньне Манчжурыі для Кітаю, Мацуока заклікаў у канцы ў імя міру і парадку на Далёкім Усходзе — ня прымаць дакладу.

Пасьля прамоў прадстаўнікоў Венецуэлы, Канады, Літвы, даклад быў прыняты. ЗА ДАКЛАД ВЫКАЗАЛІСЯ 42 КРАІНЫ, у тым ліку Кітай. Дэлегат СІАМА ўстрымаўся ад галасаваньня. Японія галасавала супроць.

Пасьля гэтага Мацуока прачытаў наступную кароткую заяву аб адхіленьні даклада Японіяй:

«Японскі ўрад вымушаны прыйці да вываду, што погляды Японіі і другіх членаў Лігі нацый на мэтады дасягненьня міра на Далёкім Усходзе не супадаюць. Японскі ўрад вымушаны прыйці да перакананьня, што яго спробы супрацоўнічаць з Лігай нацый у адносінах япона-кітайскіх рознагалосьсяў дасягнулі мяжы. Японскі ўрад, аднак, будзе ўжываць усе сілы для ўстанаўленьня міру і дружскіх сэрдэчных адносін з іншымі дзяржавамі. Я павінен дадаць, што японскі ўрад, імкнучыся садзейнічаць добрабыту чалавецтва будзе з усёй шчырасьцю працягваць супрацоўніцтва ў справе ўсеагульнага міру».

Пасьля заявы, Мацуока разам з іншымі членамі японскай дэлегацыі ПАКІНУЎ ЗАЛЮ. У палітычных колах адзначаюць, што ў прамове Мацуока ня было намёкаў на выхад Японіі з Лігі нацый.

Пастановы пленуму Лігі нацый

ЖЭНЭВА. 24-ІІ. На вячэрнім паседжаньні пленума Лігі нацый японская дэлегацыя ўжо адсутнічала. Гіманс, адкрыўшы гэтае паседжаньне, абвясьціў праект рэзалюцыі ад імя «камісіі 19-ці». Пленум Лігі пастанаўляе: стварыць кансультацыйны камітэт у складзе прадстаўнікоў членаў «камісіі 19-ці», дэлегатаў Канады і Галяндыі; лічыць неабходным запрасіць ўрады ПАЗШ і СССР супрацоўнічаць у работах камітэту, даручае камітэту сачыць за разьвіцьцём канфлікта і дапамагаць пленуму выканаць яго місію на аснове 3 пункту 3 арт. уст. Лігі нацый, а так сама дапамагаць у тых-жа мэтах членам Лігі ўзгадніць, як між сабою, так і між ня членамі Лігі, іх пазыцыі і дзеяньні. У рэзалюцыі падкрэсьліваецца, што пленум ня лічыць сваю сэсію закончанай і што ён можа быць склікаены ў любы момант.

**

ЖЭНЭВА. 25-ІІ. Адбылося паседжаньне выдзеленага пленумам Лігі нацый кансультатыўнага камітэту, на якім прынята пастанова запрасіць ПАЗШ і СССР удзельнічаць у работах камітэту. Пастаноўлена на наступным паседжаньні камітэту абгаварыць пытаньне аб стварэньні падкамісіі для ўсебаковага вывучэньня пытаньня аб забароне вывазу зброі на Далёкі Ўсход.

НА ЗДЫМКУ: Берлінскія безпрацоўныя на біржы працы, прышоўшыя атрымаць работу прастойваюць гадзінамі ў чарзе толькі покуль зарэгістрыруюцца.

Японскія дэлегаты выяжджаюць з Жэнэвы

ЖЭНЭВА. 25-ІІ. Мацуока, Нагаока і Сато пакідаюць Жэнэву, дзе астаецца загадчык японскім бюро пры Лігі нацый Савага. Што датычыцца японскай дэлегацыі на канфэрэнцыі па «разброеньні», дык адмірал Магані і генэрал Дзецекава чакаюць інструкцый з Токіо.

Ультыматум нанкінскаму Ўраду

ШАНХАЙ. 24-ІІ. Учора японскі консул у Нанкіне Іемура ўручыў міністру замежных спраў Нанкінскага ўраду Ло-Вень-Каню мэмарандум, які патрабуе эвакуацыі кітайскага войска з Жэхэ. У мэмарандуме ўказваецца, што войска манчжурскага ўраду ў супрацоўніцтве з японскім войскам прыступіла да ачышчэньня Жэхэ ад «бандытаў». Прабываньне войска ЧЖАН Сюэ-Ляна ў Жэхэ — адзначаецца ў мэмарандуме—несумяшчальна з сувэрэннымі правамі Манчжоу Го, а таксама перашкаджае аднаўленьню міра і парадку ў Жэхэ. Калі войска Чжан Сюэ-Ляна, падкрэсьліваецца ў мэмарандуме, будзе працягваць супраціўляцца, дык узьнікне цяжкасьць гарантаваць, што ўзброеная барацьба не распашырыцца на Паўночны Кітай, хаця ў прынцыпе вырашана, што войска Манчжоу Го і японская армія будуць аставацца ў межах тэрыторыі Манчжоу Го.

У адказ на гэты мэмарандум Нанкінскі ўрад указвае, што адпраўляючы войска ў Жэхэ ён ажыцьцяўляе свае непарушныя сувэрэнныя правы. Японскае патрабаваньне аб вывадзе кітайскага войска з Жэхэ, гаворыцца ў адказе, адзначае пашырэньне сферы японскай агрэсіі і далейшае парушэньне тэрытарыяльнай цэласьці Кітаю. Таму адказнасьць за ваеннае ўварваньне ў Жэхэ падае на японскі ўрад.

Генэральнае наступленьне японскага войска ў Жэхэ

ТОКІО. 25-ІІ. Апублікавана камюніке ваенага міністэрства, а таксама камандваньня квантунскай арміі, у якіх указваецца, што 25 лютага пачаліся буйныя ваенныя апэрацыі, накіраваныя да «аднаўленьня парадка ў Жэхэ». Сьцьвярджаючы папярэднія паведамленьні аб заняцьці японскім войскам Бэйпяо і ваенныя дзеяньні ў раёне Кайлу, камюніке ўказвае, што гэта зьяўляецца падрыхтоўчай мерай да апэрацый у буйным маштабе, якія сёньня пачынаюцца.

У камюніке генэрала Муто ўказваецца, што квантунская армія не намерваецца прасунуцца на поўдзень за Вялікую Сьцяну, калі толькі «супраціўленьне кітайскага войска не прымусіць зьвярнуцца да гэтай мэты». У камюніке ўказваецца, што кітайскія часьці пакуль што не аказалі ніякага сур'ёзнага супраціўленьня японскаму войску, і, ў прыватнасьці, добра ўмацаваны пункт Бяйпяо перайшоў у рукі японцаў фактычна бяз бою.

Паводле японскіх даных, у апэрацыях у Жэхэ ўдзельнічае 50.000 ЯПОНАМАНЧЖУРСКАГА ВОЙСКА, з якога палова японцаў. Паводле гэтых даных, у Жэхэ налічваецца каля 125.000 КІТАЙСКАГА ВОЙСКА, з якога больш паловы — добраахвотнікі.

Паводле японскіх паведамленьняў, гэтымі днямі ў Жэхэ прыбылі дзьве новыя брыгады войска Чжан Сюэ-Ляна ў дапаўненьне да 4-х брыгадаў Чжан Сюэ-Ляна, якія ўжо знаходзяцца ў Жэхэ. Паводле гэтых-жа паведамленьняў, войска Тан Юй Ліна (старшыня правінцыяльнага ўраду Жэхэ) налічвае 25.000 штыхоў. Войска Чжан Сюэ-Ляна—35.000 штыхоў і добраахвотніцкія часьці—65.000 штыхоў.

Ваенныя дзеяньні на граніцах Жэхэ.

НА ЗДЫМКУ: Паходная радыёстанцыя японцаў у кітайскай вёсцы, якая занята японскімі войскамі.

Нескарыстаныя рэсурсы

БССР мае вялізарныя рыбныя багацьці. 80.000 га азёр, 32.000 клм рэк, 2.000 га пойм, 1.800 га эксплёатуемых сажалак і 2.000 га, якія знаходзяцца ў стадыі арганізацыі,—перасякаюць Беларусь ўздоўж і папярок. Акрамя таго, дзякуючы, штогодняму павялічэньню торфараспрацовак, мы атрымліваем новыя вадаёмы на тарфяных кар'ерах.

Здавалася-б, што пры такой вялізарнай колькасьці натуральных і штучных вадаёмаў беларускі рынак павінен быў быць насычаны надта важным прадуктам харчаваньня—рыбай, якой рабочы спажывец не забясьпечаны яшчэ ў дастатковай меры.

Як ня дзіўна, але значную колькасьць рыбных прадуктаў нам прыходзіцца завозіць ня толькі ў кансэрваным відзе, але і ў сьвежым—з іншых рэспублік Савецкага Саюзу.

Усё гэта атрымліваецца з-за няўменьня арганізаваць рыбную гаспадарку.

Белрыбаксаюз і спажыўкаапэрацыя, якія таксама павінны займацца пытаньнямі рыбаводзтва і рыбаразьвядзеньня, не спраўляюцца нават з абловам існуючых вадаёмаў.

Такім чынам Белрыбсаюз і сыстэма спажыўкаапэрацыі ня справіліся з ускладзенымі на іх задачамі па арганізацыі аблову натуральных вадаёмаў, не аўладалі тэхнікай лову.

Зусім бязьдзейнічаюць у гэтых адносінах і торфаб'яднаньні, якія маглі-б на сваіх тарфяных кар'ерах арганізаваць вялізарныя рыбныя гаспадаркі, і тым самым значна палепшыць забясьпечаньне рабочых торфараспрацовак. Аднак, Белторф і іншыя тарфяныя арганізацыі лічаць за лепшае трымаць сваіх рабочых на цэнтралізаваным пайку Наркамснабу, чым займацца пытаньнем рыбаводзтва шляхам арганізацыі на тарфяных кар'ерах рыбных гаспадарак.

Апошняя пастанова партыі і ўраду аб рэарганізацыі сыстэмы снабжэньня рабочых павінна заставіць наканец гаспадарнікаў з Белторфу практычна заняцца пытаньнем выкарыстаньня тарфяных кар'ераў для рыбаводзтва. Для гэтага ёсьць усе магчымасьці. Так, вопыты Белрыбтрэсту ўстанавілі, што спушчаныя для нагулу ў тарфяныя сажалкі сегалеткі карпа і ляшча на працягу 45 дзён знаходжаньня ў гэтых вадаёмах атрымалі прырост ў сваёй вазе кожная ад 400 да 600 грам. г. зн., што карп і лешч ня толькі могуць жыць у тарфяных кар'ерах, але і атрымліваюць значны прырост ад нагулак.

Грунтуючыся на дырэктывах 17-й партканфэрэнцыі аб утраеньні норм таннага спажываньня харчовых прадуктаў да канца другой пяцігодкі, мы з дастатковай перакананасьцю можам сказаць, што гэтага ўтраеньня па рыбных прадуктах магчыма дасягнуць значна раней. Для гэтага патрэбна толькі ў корані перабудаваць усю сыстэму рыбнай гаспадаркі.

Перш за ўсё, усе буйныя азёрныя прасторы як напрыклад: возёра Князь, Асьвея, Лісна, Нішчэдра, Лікатно і іншыя, якія знаходзяцца пад ведамам Белрыбаксаюзу, неабходна тэрмінова перадаць Белрыбтрэсту і арганізаваць на іх паказальныя рыбныя гаспадаркі, дзе патрэбна будзе ня толькі арганізаваць болей дэталёвы аблоў і зьнішчэньне драпежнікаў, але і заняцца рыбаразьвядзеньнем ў шырокім сэнсе гэтага слова. Белрыбтрэст, выходзячы з вопытаў вядзеньня яго гаспадаркі ў мінулым, здолее больш прадукцыйна выкарыстаць гэтыя водныя прасторы.

У сыстэме Белрыбаксаюзу і спажыўкаапэрацыі павінны застацца толькі больш дробныя азёрныя прасторы і рачныя басэйны. Гэтым арганізацыям патрэбна будзе заняцца мэханізацыяй і павялічэньнем аблову эксплёатуемых імі вадаёмаў.

Урэшце Белторфаб'яднаньне, пачынаючы з вясны 1933 г., павінна заняцца рыбаразьвядзеньнем на сваіх тарфяных кар'ерах шляхам закупкі сегалеткі ў Белрыбтрэсьце і пасадкі іх у тарфяныя сажалкі, а ў далейшым шляхам арганізацыі ўласнай рыбнай гаспадаркі.

Згодна распрацаванага пляну другой пяцігодкі разьвіцьця рыбнай гаспадаркі Беларусі норма спажываньня рыбы па ўсіх відах на 1937 г. запраектавана ў сярэднім па 15 клг на чалавека, гэта значыць, што для задаваленьня патрэб у рыбе ўсяго насельніцтва Беларусі патрэбна будзе мець у сьвежым, засоленым і кансэрваваным відах 91500 тон.

Перад гаспадарчымі арганізацыямі і ў прыватнасьці перад Белрыбтрэстам стаіць задача задаволіць поўнасьцю патрэбы насельніцтва ў сьвежай рыбе з уласных вадаёмаў Беларусі, а гэта будзе складаць каля 50 проц. запраектаванай нормы спажываньня.

Толькі пры правільнай арганізацыі рыбнай гаспадаркі, пры мабілізацыі ўвагі шырокіх працоўных мас і гаспадарчых арганізацый гэта задача будзе ня толькі ажыцьцёўлена, але і перавыканана. Для гэтага патрэбна будзе нашы вадаёмы ператварыць у культурныя адзінкі савецкай рыбнай гаспадаркі.

Паведамленьне

ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 28 лютага г. г. а 10-й гадзіне раніцы г. Менску (ЦКК КП(б)Б) будзе працаваць выязная камісія ЦКК УсеКП(б) па разгляду апэляцыйных партспраў наступных т. т.: Бароўскі А. П., Барысук Ф. Р., Вячэрскі І. М., Вараб'ёў, А. Я., Гулкова В. А., Глушакоў Р. Р., Гефцер А. А., Гарашчэня Ц. Л., Гурэвіч Л. І., Зянькоў А. Т., Каган Г. Б., Клуйша Б. О., Конікаў С. І., Каплан Ю. П., Караткевіч П. К., Клопаў П. С., Крэсьлін М. А., Лобыр Г. Г., Лебедзеў Я. Е., Мазур К. І., Машко К. Ф., Мельнікаў П. А., Мілашэўскі Л. В., Майсеенка К. А., Мацыеўскі П. Я., Насевіч М. Ф., Ольнеп Л. К., Пушчын Ф. Ф., Паўловіч А. П., Пэкер А. Х., Пузенко Я. М., Прахін В. А., Рамановіч К. Н., Столярчук П. І., Семенас Б. К., Сьцепаненка Л. Р., Смоліч Е. О., Саракалетаў Ф. А., Стваліnскі М. Б., Тэвелеў П. С., Тіліпенка М. І., Хорошка І. Р., Шчэбелеў Г. С., Шышко М. Л., Шэтхман М. М., Ястрэнскі М. М., Рыбакоў М. А., Інлупін К. К., Працько М. І., Малыга Ткачэнка, Стрэжыс І. Д., Садовік І. Я.

Яўка пералічаных т. т. абавязкова. Праезд не аплачваецца. Выклікаемыя т.т. павінны мець пры сабе водзывы ад парт'ячэек аб сваёй апошняй рабоце.

ПК ЦКК КП(б)Б

Лёнапрадукцыю — сацыялістычнай прамысловасьці

У ШКЛОЎШЧЫНЕ ПАТУРАЮЦЬ КУЛАЦКАМУ САБАТАЖУ ЛЁНАЗАГАТОВАК

„Скончыць поўнае выкананьне пляну лёназагатовак да 27 лютага 1933 году з тым, каб да 1 сакавіка былі падведзены вынікі аб поўным выкананьні пляну. Пленум ЦК і ЦКК папярэджвае РК і РВК, што гэты тэрмін зьяўляецца канчатковым"

(З пастановы лютаўскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б)

ЧОРНАЯ ДОШКА

Пастановай ЦК КП(б)Б і СНК БССР занесены на чорную дошку наступныя раёны

ЗА ЗРЫЎ ЗАГАТОВАК ІЛЬНУ:

СЕНЬНЕНСКІ

(сакратар РК т. Дашукевіч, старшыня РВК т. Себесевіч) *)

СІРОЦІНСКІ

(сакратар РК тав. Усенка, старшыня РВК т. Ражноўскі) *)

ЗА ЗРЫЎ ЗАГАТОВАК УСІХ ВІДАЎ

ЗАНЕСЕНЫ НА ЧОРНУЮ ДОШКУ НАСТУПНЫЯ СЕЛЬСАВЕТЫ:

па Бягомльскім раёне: Дамбражыцкі с-с,
Чашніцкім р-не: Стражавіцкі,
Клічаўскім Віркаўскі,
Сурасім: Камароўскі,
па Аршанскім: Буеўскі,
Пухавіцкім: Гарэліцкі, Шацкі,
Вушацкім раёне: Усайскі,
Мсьціслаўскім раёне: Татарчанскі.

*) Упаўнаважаныя ЦК па Сеньненскім і Сіроцінскім раёнах т. т. БЕРЗІН і ВІЛЬЧАК зьняты з чорнай дошкі, як зьнятыя з пасады ўпаўнаважаных з прыцягненьнем да партыйнай адказнасьці

Пастанова ЦК КП(б)Б аб зьняцьці з чорнай дошкі Талочынскага раёну ад 21-ІІ 1933 г.

З прычыны таго, што ў Талочынскім раёне плян лёназагатовак выканан на 98,4 проц.—зьняць Талочынскі раён з чорнай дошкі, абавязаўшы сакратара РК—т. СЛАВІНА не пазьней 23-ІІ поўнасьцю выканаць гадавы плян лёнарыхтовак.

„Загатоўка" рэзалюцый у Сіроціне

СІРОЦІНА. За апошнія дні па раёне амаль зусім спыніліся лёназагатоўкі. Штодня загатаўляецца ня больш па 1-2 тоны лёнавалакна. Раённы плян на 21 лютага выкананы толькі на 58,4 пр. Спаскі, Сіроцінскі, Бараньказскі і Бобальскі сельсаветы зусім спынілі барацьбу за лён. Па гэтых сельсаветах паступае штодзень ня больш 20-30 кгр. лёнавалакна.

Ня ўсе калгасы раёну выканалі плян лёназагатовак. Калгас «Новая Захарава» (Вобальскі сельсавет) не дадаў дзяржаве 4 цнт. лёнавалакна. Старшыня калгасу Кажэка заяўляе, што «лёну няма». Але гэта кулацкая хлусьня. Лён разьмеркавалі сярод калгасьнікаў да выкананьня абавязкаў перад дзяржавай. Рэшту лёну параскрадалі Жыткоў Іван, Ляхноў, Кажэка Ганна, Гарцюкоў.

У раёне ў апошнія дні вельмі пашырылася спэкуляцыя лёнам. Асабліва наглядаецца гандаль лёнам па Вобальскім, Добейскім, Сіроцінскім, Пагарэліцкім і інш. сельсаветах, але кіраўніцтва сельсавету апартуністычна адносіцца да падобных фактаў. У Клетчанскім сельсавеце Зянькоў Язэп, ня выканаўшы сваіх абавязкаў перад дзяржавай, прадаў па базарных цэнах 46 кгр. лёну, але старшыня сельсавету Ісароўскі гэтага «не заўважыў».

Райком партыі і райвыканком апошнія дні прынялі рад пастаноў аб пасіленьні лёназагатовак. але яны праводзяцца ў жыцьцё. Так, 14 лютага РК і РВК вынесьлі 5 пастаноў, 16 лютага—7 пастаноў, 16—ня меншую колькасьць. Але сапраўднай бальшавіцкай барацьбы за лён ня відаць. Партыйная арганізацыя і вясковы актыў вёскі не мабілізаваны на барацьбу за лён. Тут патрабуецца рашуча пакончыць з дэкляратыўнасьцю, трэба пакончыць з баяздольнасьцю у барацьбе за тэхкультуры, канчаткова зламаць кулацкі сабатаж і бязьлітасна ўдарыць па гніла-лібэральных адносінах да кулака і буржуазных перараджэнцаў.

(Белта).

„У Крупках міндальнічаюць з кулаком"

(„Савецкая Беларусь" ад 15-ІІ)

Крупскі райком партыі паведамляе, што заметка зьмешчаная ў «Савецкай Беларусі»—поўнасьцю правільная. На рад асоб райком налажыў суровыя партспагнаньні. Старшыня Выдрыцкага с-с зьняты з работы.

Фракцыі РВК у трохдзённы тэрмін прапанавана праверыць фактычнае выкананьне цьвёрдых заданьняў па адстаючых сельсаветах.

Увесь раённы актыў мабілізаваны і накіраваны ў сельсаветы да 20 лютага для сканчэньня лёназагатовак.

Ход загатовак ільнавалакна па ільнаводным раёнам

(у процантах да гадовага пляну на 25 лютага)

РАЁНЫ	Процант выкананьня гадовага пляну
1. Чавускі	103,6
2. Лёзьненскі	99,8
3. Чашніцкі	99,0
4. Крупскі	97,6
5. Талачынскі	97,9
6. Бялыніцкі	94,6
7. Сураскі	94,1
8. Дубровенскі	94,0
9. Полацкі	89,9
10 Шклоўскі	89,5
11 Лепельскі	86,3
12. Горацкі	85,5
13. Гарадоцкі	84,5
14. Расонскі	84,1
15. Вушацкі	83,1
16. Сеньненскі	78,1
17. Дрысенскі	77,7
18 Бешанковіцкі	76,2
19. Асьвейскі	74,1
20. Мсьціслаўскі	69,1
21. Сіроцінскі	61,1
Разам па ільнаводчых раёнах	86,5
Разам па БССР	89,5

Сабатажнікам аб'яўлена амністыя

ШКЛОЎ. (Наш кар.). Лёназагатоўкі ў раёне фактычна спыніліся. За першую дэкаду лютага загатоўлена ледзь 3 проц. гадавога пляну. На 21 лютага раённы плян выкананы толькі на 89,5 проц., ня гледзячы на тое, што мінулі ўсе тэрміны для завяршэньня загатовак.

У чым прычына такіх недапушчальна-марудных тэмпаў работы, дзе тоіцца тормазы лёназагатовак? Галоўнае гэта—паслабленьне ўвагі да загатовак з боку раду партячэек, пашырэньне дэмабілізацыйных настрояў, слабы націск на кулацка-заможныя гаспадаркі. Замест спалучэньня падрыхтоўкі да сяўбы з лёназагатоўкамі ў радзе сельсаветаў зусім спыніліся загатоўкі. З 28 сельсаветаў раёну толькі 6 цалкам выканалі пляны—Заходзкі, Ст.-Вадзянскі, Высоцкі, Княжыцкі, Гарадзішчанскі, Нічыпароўскі. Рэшта 22 сельсаветы выканалі пляны ад 40 да 90 проц.

Гэтымі апартуністычнымі настроямі ў барацьбе за лён карыстаецца кулак, які ўсімі мерамі імкнецца ўкіліцца ад лёназагатовак. У Таўкачоўскім сельсавеце партлячэйка і ўпаўнаважаны РК і РВК НОВІКАЎ зусім ня кіруюць загатоўкамі. Тав. Новікаў нават ня ведае ў якім стане знаходзяцца лёназагатоўкі па сельсавеце, сельсавет не вядзе ўліку выкананьня цьвёрдых заданьняў.

Калгас імя 5-годка ў 4 гады, Ардашкага сельсавету, ня выканаўшы пляны лёназагатовак, разьмеркаваў лён сярод калгасьнікаў. Зараз некаторыя калгасьнікі ня ведаюць куды дзець лён. Шмат трасты кідаюць на подсьціл жывёле. Па віне праўленьня калгасу папсавана шмат пянькі.

Падкулачнікі і цьвёрдавікі, якія празьлезьлі ў калгас «Калектыўная праца» (Чарнаруцкі сельсавет) сарвалі выкананьне лёназагатовак, увесь лён яны расьцягалі і пусьцілі яго на стрэхі.

У калгасе «Чырвоны Кастрычнік», гэтага-ж сельсавету, плян лёназагатовак недавыкананы на 100 цнт., лён пакраў Філіпаў С. (член партыі) і інш., якія выкарысталі лёнатрасту на стрэхі. Чарнаруцкая ячэйка КП(б)Б не прыняла ніякіх мер у адносінах да «партыйца» Філіпава. Замест таго, каб пакараць гэтага перараджэнца і выгнаць яго з партыі, ячэйка замазала гэту справу, бо сакратаром ячэйкі зьяўляецца брат Філіпава.

Трэба бязьлітасна выкрыць усе кулацкія хітрыкі, накіраваныя на зрыў лёназагатовак. Увесь раскрадзены і пахаваны лён неабходна неадкладна выявіць і здаць яго на прыёмачныя пункты. Ніякай літасьці да сабатажнікаў загатовак і раскрадальнікаў грамадзкай маемасьці.

Ул. Стромскі.

Лён згнаіў

БЯРЭЗІНА. Старшыня калгасу імя Першага мая, К-Борскага сельсавету, Мурашка зусім ня цікавіцца ўмацаваньнем калгаснай вытворчасьці. У калгасе пануюць вялікія непарадкі, але Мурашку гэта мала абходзіць. Па яго віне калгас ня выканаў пляну лёназагатовак, не дадана яшчэ 2 цнт лёнавалакна.

Мурашка зноў папсаваў лён. Калгасьнікі неаднаразова заяўлялі старшыні, што лён пераляжаў, што трэба прыступіць да апрацоўкі яго, але Мурашка заўсёды адказваў: «няхай паляжыць». У выніку гэтага, каля двух вазоў лёну папсавалася. Зараз-жа, каб выканаць плян, Мурашка імкнецца здаць (прадаць) у загатоўкі пакульле замест добрага валакна.

Райпракуратура павінна неадкладна заняцца пытаньнем злоснага зрыву лёназагатовак у калгасе імя Першага мая. Мурашка павінен быць сурова пакараны за псаваньне лёнпрадукцыі.

Б. Р.

Домна № 7, узяла першынства на конкурсе домен. НА ЗДЫМКУ: Домна № 7 заводу імя Дзяржынскага (УССР) за работай.

Хроніка

Вынікі конкурсу вагонарамонтных заводаў

▲ Журы Усесаюзнага конкурсу заводаў «Усесаюзнага аб'яднаньня вагонарамонтных заводаў», ЦК саюзу Чыгуначнікаў і газэты «Гудок» вызначыла Гомельскаму заводу імя Ланцуцкага другую прэмію ў 13.000 руб. за добрыя вытворчыя паказчыкі. Атрыманую суму мяркуецца скарыстаць на палепшаньне сацыялістычна-бытавых умоў рабочых заводу.

▲ Да 50-годзьдзя са дню сьмерці Карла Маркса Віцебскі сацыялістычна-гістарычны музэй арганізоўвае выстаўку «Жыцьцё і дзейнасьць Карла Маркса». На выстаўцы будзе адлюстравана рэвалюцыя 1848 году ў Цэнтральнай Эўропе і гісторыя Парыскай камуны. Выстаўка будзе адкрыта з 1 сакавіка.

▲ На паседжаньні праўленьня саюзу мастакоў сумесна з прадстаўнікамі ад Віцебску і Гомелю абраны прэзыдыум праўленьня ў складзе трох асоб: т. т. Гаўрыленка (старшыня), Грубэ (намесьнік старшыні) і Кастэлянскі (адказны сакратар).

▲ Рабочыя, служачыя і ІТР фабрыкі і фанэрнага заводу «Вэзуві» (Нова беліца) ў адказ на выклік рабочых заводу імя Ланцуцкага пастанавілі адпрацаваць адзін рабочы дзень на пабудову самалёту «Пралетары Гомельшчыны».

На агульна-заводзкай рабочай канфэрэнцыі рабочы ўдарнік фанэрнага заводу тав. Равенкоў зрабіў пачын у добраахвотным узносе грошай на пабудову самалёта і выклікаў на сацспаборніцтва ўсіх рабочых. Тут-жа на канфэрэнцыі было сабрана 203 руб.

▲ Закончыўся шахматны турнір БВА, у якім прымалі ўдзел пераможцы гарнізонных спаборніцтваў. Першае месца заняў тав. Брэйман, які з 13 партый выйграў 12. Тав. Брэйман выехаў на ўсеармейскія шахматныя спаборніцтва ў Маскву.

▲ Да дню Парыскай камуны на Віцебскім чыгуначным вузьле пачалася перавыбарчая кампанія бюро ячэек МОПР. Кампанія праходзіць пад знакам узмацненьня інтэрнацыянальнай работы на чыгунцы.

▲ Старшынёю бюро фізкультуры ЦСПСБ абраны тав. Вальфсон.

▲ 5.460 руб. унесьлі ў ашчадкасу рабочыя віцебскай фабрыкі імя Лекерта за час варшаўскай эстафэты.

▲ 3 перасоўчыя лыжныя базы для абслугоўваньня агранамджанага сэктару вёскі арганізаваны Бабруйскім райсаветам фізкультуры.

▲ 6.000 руб. адпушчана прэзыдыумам Менгарсавету на культурныя і бытавыя патрэбы падшэфных вайсковых часьцяй і 5.000 руб. менскаму гарнізону.

▲ Фотааддзяленьнем Мендзяржкіно абсталяваны ва ўсіх кінотэатрах і вайсковых часьцях фота-выстаўкі, якія адлюстроўваюць жыцьцё і быт чырвонаармейцаў.

▲ 250 рабочых прапаноў сабрана па прадпрыемствах Бабруйску ў фонд 15 гадавіны Чырвонай арміі.

▲ 19 лютага ў Менску скончыліся фізкультурныя спаборніцтвы БВА. У праграму ўваходзілі спаборніцтва па лыжах, каньках, гімнастыцы, боксе і цяжарах. Пераможцы выехалі ў Маскву на ўсеармейскія фізкультурныя спаборніцтва, прысьвечаныя 15 гадавіне Чырвонай арміі.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" Каса ад 12 г. дню

Ад 21 лютага мастацкі фільм

ШАСНАЦЦАТЫ

АБ'ЯВА

Беларуск. кантора Саюзсельгасснаб „БЕЛСЕЛЬГАССНАБ"

даводзіць да ведама ўсіх яго пакупнікоў,

што ў зьвязку з сыстэматычным невыкупам радам трэстаў і саўгасаў тавараў, якія адгружаюцца ў іх адрасы наложаным платам тавараў,

у далейшым адпраўка тавараў каштоўнасьцю да 1000 руб.

БУДЗЕ ВЫТВАРАЦЦА З СКЛАДУ БЕЛСЕЛЬГАССНАБУ

толькі пасьля аплаты іх наяўнымі грашыма альбо пераводам

Белсельгасснаб.

У АДДЗЕЛ АБВЕСТАК

ЗВАНЕЦЕ па тэлефоне 2-44 па аўтамаце 22-158

Згублен у Асіпавіцкім раёне ордэн Чырвонага сьцягу за № 10232.

Знайшоўшага просьба зьвярнуцца у Сьвіслацкі сельсавет.

На падставе пастановы ЦВК і СНК БССР (бюл. № ад 20-ІІІ 1932 г.) аб парадку ўтрыманьня бруку, тратуараў і іх рамонце

БУДКАНТОРА МЕНКАМГАСУ

даводзіць да ведама ўсіх установаў жактаў і ЖСКТ,

якія павінны будаваць пры сваіх дамаўладань ях тратуары і брук,

што яны павінны не пазьней 28 лютага 1933 г.

ЗАКЛЮЧЫЦЬ УМОВЫ

з Будканторай Камгасу (Пляц Волі. № 2)

на вытварэньне паказаных работ

Пасьля паказанага тэрміну ніякія работы Будканторай прымацца ня будуць

Менкамгас

Лужасьнянскі лёнаканапляводны тэхнікум (9 клм па Гарадокскай шашы)

працягвае зімовы прыём

на першы курс тэхнікуму асоб з адукацыяй ня ніжэй 7 груп сямігодкі і роўных ёй навучальных установаў да 1 красавіка.

Заняткі пачаліся.

УВАГА: 1) узрост ад 16 да 30 год, 2) стыпэндыі ў залежнасьці ад пасьпяховасьці ад 30 да 90 руб., 3) дакуманты: аб адукацыі, сацстановішчы, здароўі, узросьце, анкета і дзьве фотакарткі, 4) 100 працэнтнае забясьпечаньне інтэрнатам без пасьцельных прылад. Ёсьць сталоўка, 5) заявы толькі з дакумантамі і ў арыгіналах і з маркамі на 30 кап. для адказу

накіроўваць па адрасе: гор. Віцебск, Лужасьнянскі лёнаканапляводны тэхнікум.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Менскі Пэдагагічны Інстытут арганізуе 27-ІІ 1933 г.

ВЯЛІКІ ЛІТАРАТУРНЫ ВЕЧАР

з удзелам дэлегатаў І-га Пленуму Аргкамітэту Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў БССР

На вечары выступаюць тав. Бэндэ з дакладам на тэму: „Сучаснае становішча беларускай літаратуры", — народныя паэты рэспублікі: Я. Купала, Я. Колас, пісьменьнікі: П. Галавач, А. Александровіч, і Харык і інш.

Пасьля выступленьняў—мастацкая частка.

Уваход па запрашальных білетах.

Пачатак а 8-й гадзіне ўвечары ў актавай залі галоўнага корпусу Унівэрсытэцкага гарадка.

МПІ.

Упаўнаваж. Галоўлітбел, № А—192.

Адказны рэдактар—П. ШАСТАКОЎ.

Друкарня імя Сталіна.